ЗЬВАЗДА

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

№ 113 (3221) Серада, 22-га Мая 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЁ НОЧЫ:

ШАНХАЙ, 21. У адказна ультыматыўную тэлеграму Чан-Кай-шы Фын-Юй-сян абвясьціў сябе галоўнакамандуючым ваеннай экспэдыцыі супроць „здрадніка бацькаўшчыны і Гаміндану" (г. зн. супроць Чан-Кай-шы)

НАВІНЫ Б. С. С. Р.

За забойства бедняка-актывістага Бабруйскі акруговы суд прыгаварыў двух кулакоў да расстрэлу

У 1929-30 навучальным годзе ў Беларусі адкрываецца рад новых навучальных установаў

Водгукі палітычнай расправы ў Бэрліне

У Бэрлінскіх падзеях буржуазны і сацыял-дэмакратычны друк бачыць «руку Масквы». («Правда»).



Клясавая барацьба ў Польшчы

Сялянскія хваляваньні ў Заходняй Украіне, аб якіх паведамляюць сёньняшнія тэлеграмы, сьведчаць аб моцным абвастрэньні клясавых супярэчнасьцяй у сучаснай Польшчы. Буйнае землеўладаньне зьяўляецца, як вядома, аднэй з галоўных апор пілсудчыны. Хутка пасьля захопу ўлады ў 1926 годзе Пілсудскі заключыў з аграрыямі саюз. Гэты саюз, які існуе і па сеньняшні дзень і які вызначае характар урадавай палітыкі ў цэлым, павінен быў адбіцца і мацней усяго на аграрнай палітыцы фашысцкага ўраду. Пасты міністраў земляробства і аграрных рэформ заняты стаўленьнікамі буйнага землеўладаньня, і паціск на вясковую беднату і батраццкоў узмацняецца з году ў год. За апошні час паціск гэты ўзмацніўся ў зьвязку з прагрэсуючым разлажэньнем вёскі. Польскі фашызм ставіць стаўку на кулака. Міэрная «аграрная рэформа», якая прадугледжвае пераход да сялянства памешчыцкіх зямель (ня ўсіх, зразумела, а толькі нязначнай часткі па надзвычайна высокіх цэнах), не магла нічога даць беднаце. Наадварот, гэта куцая рэформа, у той нязначнай меры, у якой яна праводзілася ў жыцьцё, садзейнічала толькі ўзмацненьню кулацтва. Гэтаму-жа садзейнічала і крэдытная палітыка ўраду. У тымжа напрамку дзейнічаў апарат улады на мясцох.

Восеньню мінулага году паціск аграрыяў, кулацтва і ўлады выклікаў упяршыню энэргічны адпор з боку вясковай беднаты. У розных частках Польшчы выбухнулі тады хваляваньні. Пачаліся забастоўкі с.-г. рабочых. Адбыліся крывавыя сутычкі з войскамі і паліцыяй. Найбольш моцныя выступленьні сялян былі ў заходняй Украіне, дзе да эканамічнага ўціску далучаецца яшчэ ўціск нацыянальны, дзе польскія памешчыкі гаспадараць, як у калёніі. Зіма бягучага году была надзвычайна цяжкай для польскага сялянства. Частковы няўраджай (сялянства Віленшчыны перажывае ўсе жахі голаду), ніскія цэны на с.-г. прадукты, жорсткія меры пры выкалачваньні падаткаў з беднаты (Пілсудскаму патрэбны для «ваенных гульняй» вялікія сродкі),—усё гэта выклікае моцнае незадаваленьне ў польскай вёсцы. ППС і цесна з ёю зьвязаныя дробна-буржуазныя «Вызваленьне» і сялянская партыя спрабуюць супакоіць усхваляваныя сялянскія масы, высоўваючы патрабаваньне накіштаў «справядлівага разьмеркаваньня падаткаў, рэформы пазямельнага падатку, незалежнасьці дзяржаўнай улады ад буйнага землеўладаньня» (першамайская адозва ППС).

У процівагу гэтым частковым патрабаваньням, што сеюць ілюзіі, кампартыя і рэвалюцыйныя сялянскія арганізацыі ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі высоўваюць перад сялянствам лёзунг барацьбы за зямлю бяз выкупу, барацьбы за рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад, які адзін толькі дасьць сялянству зямлю і вызваліць яе ад эканамічнага і нацыянальнага прыгнечаньня. («Правда»).

Латвійская буржуазія на паслугах Польшчы

Сплата польскім памешчыкам за канфіскаваную зямлю

РЫГА, 18. Орган латвійскіх с.-д. «Сацыял-Дэмакратс» прысьвечае вялікі артыкул цьверджаньню польскай газэты «Дзень Польскі» быццам Латвія абавязвалася сплаціць польскім памешчыкам 5 млн. лат за зямлю забраную ў парадку аграрнай рэформы. «Сацыял-Дэмакратс»—піша:

«Міністар замежных спраў Балодыс, адказваючы на запытаньне ў сойме, заявіў, што нічога падобнага няма і што яму аб падобнай згодзе з Польшчай нічога невядома. Цяпер справа пачынае прымаць дзіўны характар. Ці сапраўды польска-латвійскі гандлёвы дагавор настолькі сакрэтны, што абодва бакі абавязаліся яго не агалошваць. Трудна сабе ўявіць, каб паведамленьне аб звароце страт польскім памешчыкам было ўзята са столі. Таму ўзьнікае пытаньне: на якой падставе ўрад на свой страх і рызыку, бяз ведама сойму, мог даць такія абавязацельствы Польшчы, якія каштуюць 5 млн. лат».

У заключэньне газэта патрабуе афіцыйнага растлумачэньня ўраду па гэтым пытаньні. (ТАСС).

Абвастрэньне фінансавага крызісу ў Румыніі

ВЕНА, 19. У румынскіх эканамічных колах выклікаў моцную трывогу той факт, што стабілізацыя леі ставіць прыватную гаспадарку ў цяжкае становішча. У апошні час адзначаецца масавае банкрутства гандлёвых фірмаў і прадпрыемстваў. Банкрутствы за сакавік і люты і мараторыі па плацяжох складаюць суму ў 4 мільярды лей. Эканамічны крызіс асабліва адчуваецца ў Бухарэсьце. На галоўных вуліцах сталіцы амаль кожны другі магазын закрыты. Магазыны распрадаюць тавары ніжэй сабекошту. Банкі праз суд бязьлітасна атрымліваюць ня толькі належныя ім грошы, але і нячувана высокія процанты. Ва многіх выпадках яны зусім адмаўляюць у крэдытах нават пад 100 і часта пад 200 проц.

Створанае становішча прымусіла ўрад прыступіць да распрацоўкі новага законапраекту аб банках. Законапраект прадугледжвае стварэньне цэнтральнага крэдытнага інстытуту, у склад якога павіны ўвайсьці ўсе банкі. Інстытуту прадастаўляецца права ўстанаўліваць максымальныя процанты за прадастаўляемыя асобнымі банкамі крэдыты. (ТАСС).

Стварэньне „арміі выратаваньня" ў Румыніі

ВЕНА, 10. Як падае «Адэвэрул» у даліне Жылавы ўзьнік рух за стварэньне «арміі выратаваньня». Ініцыятыва ў гэтай справе выходзіць ад лібэралаў. Арганізацыю мяркуецца назваць «Оашта Домнулуй» («армія господа»). Газэта выказвае думку, што лібэралы хочуць пад заслонай рэлігійнай арганізацыі стварыць саюз для барацьбы з баявымі арганізацыямі нацыянал-царанісцкай партыі. (ТАСС).

ВОДГУКІ ПЕРШАГА МАЯ Ў БЭРЛІНЕ

ПАСЕДЖАНЬНЕ ГРАМАДЗКАГА КАМІТЭТУ

Лева-буржуазны пісьменьнік Гросман ганьбіць сац.-фашыстых

Уплывы кампартыі растуць

БЭРЛІН, 17. 15-га мая ў Бэрліне адбыўся пасяджэньне грамадзкага камітэту па расьсьледваньні падзей 1-га мая. На гэтым пасяджэньні былі заслуханы паведамленьні аб дзейнасьці камітэту і аб бліжэйшых яго задачах.

З вялікай прамовай, якая выкрывае ілжывыя паведамленьні буржуазнага і с-д. друку, выступіў лева-буржуазны пісьменьнік Стэфан Гросман. Ён зазначыў, што **ад часу вайны ніколі не распаўсюджвалася столькі хлусьні сярод насельніцтва, як у гэтыя дні. Асабліва кляйміў Гросман с-д. орган «Форвэртс» за скажэньне сапраўднага становішча рэчаў і падзей у першамайскія дні.** Гросман прапанаваў начальніку паліцыі Цэргібелю прыняць удзел у работах камітэту.

«Камітэт,—заявіў Гросман,—ня супакоіцца да таго часу, покуль ён ня высьвятліць, хто вінаваты ў сьмерці 24 чалавек». Асабліва вітаў Гросман той факт, што кампартыя выказала гатоўнасьць прадставіць камітэту ўвесь матар'ял, які ёсьць у яе распараджэньні. **Вынікі работ камітэту,—скончыў Гросман,—будуць так моцна гучэць па ўсёй краіне, што іх ніхто ніякім крыкам ня заглушыць».**

Гарадзкі дарадца, доктар Шмінке заявіў, што сьледзтва нельга даручаць уладзе, бо ўлада праз пасрэдніцтва свайго с-д. міністра ўнутраных спраў Грэзінскага паведамляе грамадзкай думцы няверныя весткі. Шмінке зазначае, што наперакор цьверджаньням Грэзінскага **установлена, што ўсе стрэлы, якія прынесьлі сьмерць, былі зроблены паліцэйскімі.**

Дэпутат ляндтагу Тымпе паведаміў, што ў камітэт паступіла 150 заяў, пры чым асобы, іх падпісаўшыя, згаджаюцца пад прысягай пацьвердзіць свае паказаньні.

Падзеі 1-га мая зьяўляюцца прадметам расьсьледваньня і другой камісіі, утворанай Лігай абароны праў чалавека. Для дзейнасьці гэтай камісіі характэрным зьяўляецца іх адмова дапусьціць да ўдзелу ў камісіі асоб, «падазроных у камунізме». За кулісамі гэтай камісіі дзейнічаюць сацыял-дэмакраты, якія хочуць дабіцца выгаднага для Цэргібеля заключэньня. (ТАСС).

Масавы прыцёк рабочых у КПН

БЭРЛІН, 15. Крывавыя майскія падзеі ў Бэрліне далі нямецкім рабочым дасканалы ўрок клясавай барацьбы. У выніку прыцёк рабочых у кампартыю значна ўзрос. Рад вытворчых і тэрытарыяльных ячэек кампартыі ў Бэрліне прыняў за апошні дні вялікі лік новых членаў. У Ніжня-рэйнскай акрузе ў кампартыю ўступіла 700 рабочых. Побач з арганізацыйным ростам значна ўзмацніўся і палітычны ўплыў кампартыі. У акрузе Гальле-Мэрзэбург с.-д. рабочыя па закліку кампартыі абвясьцілі забастоўку. У Лейпцыгскай дэманстрацыі супроць крывавай лазьні ў Бэрліне ўдзельнічаў рад с.-д. рабочых, якія канчаткова парвалі са сваёй партыяй. (ТАСС).

Дастойны адказ рабочых мас с.-д. вымыслам

БЭРЛІН, 16. На перавыбарах фабкому ў Бэрлінскім мэталюргічным прадпрыемстве «Бэргман Вэрк» сьпіс рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў атрымаў 2.105 галасоў, а сьпіс рэфармістых—1.008 галасоў. Значэньне гэтай перамогі рэвалюцыйнага крыла заключаецца ў тым, што перавыбары адбываліся пасьля першамайскіх падзей у Бэрліне і, такім чынам, абвяргаюць вымыслы с.-д., быццам, уплыў камуністых сярод рабочых мас паменшыўся ў зьвязку з першамайскімі падзеямі. (ТАСС).

Выдача суду 2-х камдэпутатаў рэйхстагу

БЭРЛІН, 16. Учора рэйхстаг пазбавіў дэпутацкай недатыкальнасьці двух камуністычных дэпутатаў. Дэпутат Флорын прыцягваецца да судовай адказнасьці за падпісаньне лістоўкі, накіраванай рэвалюцыйнай меншасьцю прафсаюзу горнарабочых супроць рэфармісцкага лідэра саюзу Гузэмана. Дэпутат Бэрц выданы суду за тое, што ён у часе абгаварэньня законапраекту аб выдачы дапамогі беспрацоўным, нібы, абразіў чыноўніка крымвышуку, які знаходзіцца ў рэйстагу. (ТАСС).

У КІТАІ

НАНКІН РЫХТУЕЦЦА ДА СХВАТКІ З ФЫНАМ

УЛЬТЫМАТУМ ЧАН КАЙ-ШЫ

ШАНХАЙ, 18. Апублікаваны тэлеграмы Чан Кай-шы, у якіх ён настойлівае патрабуе прыбыцьця Фынь Юй-сяна ў Нанкін, каб пакончыць з усялякімі чуткамі аб нямінучай вайне. Чан Кай-шы адзначае, што ёсьць чуткі, быццам Фынь Юй-сян закупляе амуніцыю і ваенныя матар'ялы ў мэтах захаваньня ў сваіх руках паўночнага ўсходу і ня гледзячы на патрабаваньні нацыянальнага ўраду скарачае лінію абароны, каб навесьці наступленьне на Пэйпін і ўтварыць паасобныя ўрады.

Адначасова Чан Кай-шы патрабаваў ад генэрала Чан Фу-чу, бліжэйшага супрацоўніка Фынь Юй-сяна, войскі якога разбурылі частку Пэйпін-Ханькоўскай чыгункі да Ўшынглана і Чандэ каля хубэйскай граніцы, безадкладнага і поўнага вытлумачэньня гэтых дзеяньняў.

Тэлеграмы Чан Кай-шы разглядаюцца, як ультыматум. Атрыманы весткі, што Фынь Юй-сян згрупоўвае свае войскі ў раёне Лайяна. Нацыянальны ўрад спыніў адпраўку войск з Нанкіну супроць гуансійскай групоўкі, накіроўваючы буйныя сілы ў розныя стратэгічныя пункты супроць Фынь Юй-сяна. Генэралы Фынь Юй-сяна патрабуюць арганізацыі карнай арміі супроць Чан Кай-шы. (ТАСС).

Гуансійцы перайшлі ў наступленьне

ШАНХАЙ, 18. На паўднёвым фронце гуандунскія сілы перайшлі ў наступленьне. Па вестках з кітайскіх крыніц хунаньскія войскі занялі Гуэйлін (буйны горад на поўначы гуансійскай правінцыі, у 70 кілёмэтрах ад Хунаньскай граніцы) і Пінло (у Гуансі, 110 кілём. на поўдзень ад Гуанліну) і наступаюць далей у напрамку да Ўчжоу (у 150 кілёмэтрах на поўдзень ад Пінло, на Гуансійска-Гуандуньскай граніцы). (ТАСС).

Кампанія за захоп тэрыторыі Ўласна-Кітаю

ХАРБІН, 18. У Мукдэнскіх палітычных колах ажыўлена абгаворваецца пытаньне аб маючай адбыцца замене войск Тан Шэн-Чы мукдэнскімі вайскамі ў гарнізонах паўночнай часткі Хубэйскай правінцыі. Некаторыя дзеячы мукдэнскай групоўкі, асабліва сапоўнікі, якія займалі адказныя пасты ў Пэйпіне ў пэрыяд прабываньня там ураду Чжан Цзо-ліна, вядуць актыўную палітычную кампанію за прасоўваньне мукдэнскіх войск на тэрыторыю, уласна-Кітаю. (ТАСС).

Капіталістыя падтрымліваюць ангельскую рабочую партыю

ЛЁНДАН, 15. У асобе рабочай партыі, якая ператварылася ў трэцюю буржуазную партыю, многія прадстаўнікі ангельскага капіталу бачаць надзейнага абаронцу сваіх інтарэсаў і нават схільны аказваць ёй садзейнічаньне на выбарах. Так, буйны фабрыкант Бэрнгард Бэрон унёс у выбарчы фонд рабочай партыі 5.000 фунтаў стэрлінгаў (каля 50.000 руб.). (ТАСС).

Белагвардзейцы высылаюцца з Бэрліну толькі на словах

БЭРЛІН, 17. Слуханьне справы Росмана, прыцягнутага да крымінальнай адказнасьці ў зьвязку з справай фабрыкантаў анты-савецкіх фальшывак Арлова і кампаніі, пачнецца 11-га чэрвеня ў Бэрліне. Росман абвінавачваецца ў тым, што, знаходзячыся на службе ў інфармацыйным агэнцтве Зівэрта перадаў Арлову для сфатаграфаваньня 6 сакрэтных дакладаў. Акрамя таго, Росман абвінавачваецца яшчэ ў тым, што ён, будучы служачым аднаго тэлеграфнага агэнцтва, перадаваў паведамленьні канкуруючаму агэнцтву.

Слуханьне справы супроць Арлова і Сумарокава яшчэ не назначана. Газэта «Бэрлін Ам Морген» паведамляе, што рускі эмігрант Гуманскі, які прымаў удзел у фабрыкацыі анты-савецкіх фальшывак з Арловым, паранейшаму знаходзіцца ў Бэрліне, ня гледзячы на выданьне загаду аб яго высылцы. (ТАСС).

Выпікі пераводу прадпрыемствау на 7-гадзінны рабочы дзень

МАСКВА, 20. Прэзыдыум ЦК Саюзу мэталістых падагуліў вынікі пераводу на 7-мі гадзінны рабочы дзень прадпрыемстваў мэталёвай і электрапрамысловасьці. Усяго пераведзена на 7-мі гадзінны рабочы дзень 18 прадпрыемстваў, дзе заняты 60.000 рабочых. Да канца бягучага гаспадарчага году будзе пераведзена 34 прадпрыемстваў з 100.000 рабочых. Перавод даў станоўчыя вынікі: у вытворчасьць уцягнута каля 10.000 новых рабочых, павялічаны выпуск прадукцыі, узьнялася прадукцыйнасьць працы, узрасла зарплата і зьнізіўся сабекошт усіх працэсаў вытворчасьці. Прэзыдыум ЦК саюзу мэталістых прызнаў неабходным пасторыць перавод прадпрыемстваў на скарочаны рабочы дзень, лічачы, што да 1-га мая 1930 году павінна быць пераведзена ня менш 400.000 рабочых-мэталістых. (ТАСС).

У Заходняй Беларусі

Палітычны зьняволены Кэнігсбэрг знойдзен павешаным ў турме Лукішкі

ВАРШАВА, 21. У віленскай турме Лукішкі, у адзіночнай камэры, знойдзен павешаным 28-гадовы палітычны зьняволены Кэнігсбэрг, які ў 1927 г. быў засуджаны на 5 год турмы за ўдзел ў камуністычным руху.

Намецкі міністар унутраных спраў Зэвэрынг канфіскаваў прывітальную тэлеграму рускіх рабочых, пасланую нямецкім пралетарам у першамайскія дні. (З газэт).



ЗЭВЭРЫНГ: —Умацоўваць сувязь паміж рабочымі трэба... зусім іншымі мэтадамі...

УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ

Выбары прэзыдыуму

МАСКВА. На пасяджэньні 20-га мая 5-ты ўсесаюзны зьезд саветаў зацьвердзіў прэзыдыум у складзе 104 чалавек. У лік членаў прэзыдыуму ўваходзяць т.т.: **Агамалы-Оглы, Айтакаў, Андрэяў, Атабаеў, Антыпаў Н. К., Баўман, Багданаў, Гудалаў, Грэдзінскі Ф. Г., Дагадаў, Енукідзе А. Ф., Затонскі, Зеленскі, Ікрамаў, Кагановіч, Камароў, Касіёр, Косараў, Крупская, Куйбышэў, Куйбашэраў, Любчэнка, Мікаян, Молатаў, Мусабэкаў, Нэйбах, Арахэлашвілі, Орджанікідзэ, Ахвінцаў, Пятроўскі, Палуян, Рудзутак, Рыкаў, Сьмірноў, Сталін, Сырцоў, Тэр-Габрыэлян, Томскі, Уханаў, Цхакая, Чэрвяноў, Чубар, Еліава** і інш. Абраньне ў прэзыдыум т.т. **Сталіна, Рыкава, Варашылава, Молатава, Пятроўскага, Кагановіча** і інш. зьезд вітае доўгімі аплёдысмэнтамі. Зьезд пры аплёдысмэнтах абірае старшынёй зьезду тав. **Калініна** і сакратаром тав. **Енукідзе.** У склад мандатнай камісіі зьезд абірае 17 чалавек.

Зьяўленьне за сталом прэзыдыуму т.т. Сталіна, Рыкава, Пятроўскага і інш., зьезд сустракае новым выбухам аплёдысмэнтаў.

Тав. **Скрыпнік** ад імя раду дэлегацый прапануе ўнесьці некаторыя зьмены ў апублікаваны парадак дня зьезду. Гэтых зьмены зводзяцца да выключэньня з парадку дня пытаньняў не зьвязаных з праблемамі плянава-гаспадарчага будаўніцтва. Такое скарачэньне парадку дня зьезду выклікаецца неабходнасьцю згрупаваць усю ўвагу на важнейшых пытаньніх, зьвязаных з пяцігадовым плянам народнае гаспадаркі. Пытаньні, якія мяркуецца выключыць з парадку дня зьезду будуць перанесены па разгляд бліжэйшай сэсіі ЦВК Саюзу ССР.

Зьезд аднадушна згаджаецца з прапановай т. **Скрыпніка** і зьнімае з парадку дня справаздачны даклад Наркамвенмора т. Варашылава, паведамленьне ўраду РСФСР аб канстытуцыі РСФСР, зацьверджанай Усерасійскім зьездам саветаў, паведамленьне ўраду ЎССР аб канстытуцыі ЎССР, зацьверджанай Усеўкраінскім зьездам саветаў, і даклад аб зьмене артыкулу 21-га канстытуцыі Саюзу ССР.

Парадак дня зьезду

Такім чынам, зацьвярджаецца наступны парадак дня зьезду:

1. Даклад ураду СССР—т. А. І Рыкаў.
2. Пяцігадовы плян пасьвіцьця народнае гаспадаркі Саюзу ССР: агульны даклад—тав. Кржыжаноўскі Г. М. і даклад аб разьвіцьці прамысловасьці—т. Куйбышаў.
3. Аб уздыме сельскае гаспадаркі і калгаспрацыйным будаўніцтве ў вёсцы—т. М. І. Калінін.
4. Утварэньне ЦВК Саюзу ССР—выбары членаў Саюзнага Савету і зацьвярджэньне членаў савету нацыянальнасьцяй.

Потым зьезд заслухаў даклад т. Рыкава аб дзейнасьці ўраду Саюзу ССР. Увечары тав. Рыкаў скончыў першую частку свайго дакладу аб міжнародным становішчы і замежнай палітыцы ўраду СССР. Працяг дакладу—21 мая раніцай. (ТАСС).

Ранешняе пасяджаньне Усесаюзнага зьезду саветаў 21 мая

МАСКВА. Ранішняе пасяджэньне V-га ўсесаюзнага зьезду саветаў адкрылася 21 мая а 10 гадзіне раніцы пад старшынствам тав. **Чарвякова.**

Зьезд заслухаў другую частку дакладу тав. А. І. Рыкава аб унутраным і гаспадарчым становішчы Савецкага Саюзу. Па заканчэньні дакладу пачаліся спрэчкі па справаздачы ўраду СССР.

Далейшае абвастрэньне гаспадарчага крызісу ў Польшчы

Сялянскія хваляваньні ў Галіцыі

Крызіс у варшаўскай мэталёвай прамысловасьці

ВАРШАВА, 11. У Варшаўскіх мэталёвых фабрыках адбываюцца масавыя звальненьні рабочых. Ранейшыя пляны аб пашырэньні прадукцыі адкладваюцца на неазначаны час. У некаторых фабрыках рабочы тыдзень скарочаны да 4-х дзён. («Роб.»).

Звальненьне сэзонных рабочых

ВАРШАВА, 11. Варшаўскі магістрат у сувязі са зьмяншэньнем крэдытаў рэзка скарачае вадаправодныя і каналізацыйныя работы.

Ужо звольнена 500 рабочых, якія працавалі ўсю зіму.

У бліжэйшыя дні будзе звольнена яшчэ 700 рабочых. («Роб.»),

Паўстаньне сялян у Галіцыі

ВАРШАВА, 18. Сяляне воласьці Даражоў, Львоўскага ваяводзтва, узброіўшыся віламі і рыдлёўкамі, напалі на памяшканьне воласьці, пагражаючы сьмерцю членам валаснога кіраўніцтва. Паліцыя страляла ў сялян і разагнала іх. 6 сялян арыштавана. Хваляваньні ўзьніклі ў выніку нездаволеньня ўкраінскіх сялян польскай часткай валаснога кіраўніцтва. (ТАСС).

Арышты сялян у Галіцыі

ВАРШАВА, 19. У гміне Падгор'е, Дарагабыцкага павету (у Львоўскім ваяводзтве) камісія ад старосты пастанавіла прымусова засадзіць лесам частку сялянскага выгану. Сяляне аказалі камісіі супраціўленьне. Было выклікана 20 паліцэйскіх, якія арыштавалі некалькі дзясяткаў сялян. 9 сялян і та сялянкі перавезены ў турму, а рэшта звольнены. («Гл. Пр.»).

КАНФІСКАЦЫІ

ВАРШАВА, 17. У Варшаве канфіскаваны № 19 эндэцкай «Мысьлі Непадлеглай» за артыкул Сьвентахоўскага, Уладарскага і Новачынскага; № 129 «Роботніка» за артыкулы: «На трывогу» і «Ліст марш. Пілсудскага аб адстаўцы ген. Мінкевіча», № 131 «Роботніка» за артыкул: «Прыкрыя справы», «АБЦ» за артыкул «Яны».

У Лодзі канфіскаваны пэпэсэўскі «Лодзінін» за 10 мая за артыкул аб катастрафічным становішчы Лодзінскае прамысловасьці. («Роб. № 133).

У Катовіцах канфіскавана «Газэта Роботніча» за 13 мая за артыкул «Прыйшоў дань народу тое, што іншыя абяцалі». («Роб.» 137).

У Вільні канфіскаваны № 19 віленскае літоўскае часопісі «Вільнаўс Рытас» за артыкул: «Аб школьнай справе» і хранікёрскія весткі ў аддзеле «З Польшчы», («К. Біл.» 107).

Пілсудзкі незадаволены новым прэм'ерам

ВАРШАВА, 20. Дэфіцыт замежна-гандлёвага балянсу Польшчы за красавік перавышае 100 млн. злотых. Гэтая акалічнасьць выклікала сур'ёзны непакой у гандлёва-прамысловых і ўрадавых колах. У зьвязку з гэтай рэкорднай лічбай дэфіцыту склікаецца асобная ўрадавая нарада па пытаньнях замежнага гандлю. Орган бунду «Фолкс-Цэйтунг» адзначае цыркулюючыя ў апошні час у палітычных колах чуткі аб тым, што Пілсудзкі не здаволены першымі крокамі новага прэм'ера Сьвітальскага. У зьвязку з гэтым, у палітычных колах лічацца з тым, што восеньню Сьвітальскі пойдзе ў адстаўку і прэм'ерам будзе цяперашні міністр фінансаў, палкоўнік Матушэўскі. (ТАСС).

Ліквідацыя палітычнай лініі Бартэля

ВАРШАВА, 20. Усе міністэрствы ўзялі назад законапраекты, якія былі імі ўнесены ў сойм у часе апошняй сэсіі.

Камэнтуючы гэтае мерапрыемства, апазацыйны друк зазначае, што гэта адбылося згодна з пастановамі аднаго з апошніх пасяджэньняў рады міністраў, і адзначае канчаткоую ліквідацыю палітычнай лініі былога прэм'ера Бартэля. (ТАСС).

Раскол сярод пазнанскіх пілсудчыкаў

ВАРШАВА, 20. На першым пасяджэньні Пазнанскага павятовага самакіраўніцтва адбыўся фармальны раскол клюбу (фракцыі) пілсудчыкаў. Першая група, у складзе 11 чалавек, якая прадстаўляе курс так званай палкоўніцкай групы, арганізавала сваю ўласную фракцыю і выступіла пад назвай беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам. Другая значна большая частка Пілсудчыкаў, таксама арганізавала свой уласны палітычны клюб пад назвай «фракцыі гаспадарчае згоды з урадам». Паведамленьне аб гэтым першым яўным расколе ў лягеры пілсудчыкаў зрабіла вялікае ўражаньне ў варшаўскіх палітычных колах. (ТАСС).

ЗАЛЕСКІ ПАЕХАЎ У РУМЫНІЮ

ВАРШАВА, 20. Польскае тэлеграфнае агэнцтва падае: «У нядзелю вечарам міністр замежных спраў Залескі выехаў у Будапэшт».

6 МЕСЯЦАЎ КРЭПАСЬЦІ ЗА КРЫТЫКУ ПІЛСУДЗКАГА

ВАРШАВА, 17. Варшаўскі акруговы суд засудзіў на 6 месяцаў крэпасьці рэдактара пэпэсэўскае тыднёвае часопісі «Хлопска Правда» на абвінавачаньні ў непашанаваньні ўлады. У мінулым годзе пасьля вядомага выступленьня Пілсудзкага з няпрыстойнай лаянкай па адрасу Сойму і дэпутатаў, рэдактар «Хлопскае Праўды» зьмясьціў артыкул пад назвай: «Біць і штурхаць», а таксама карыкатуру.

Справа апынулася ў судзе. Акт абвінавачаньня падкрэсьліў, у якасьці ня́кага злачынства тое, што ў артыкуле была ўспамянута «галеча рабочых і сялянскіх мас». («Роб.»).

Масавыя вобыскі і арышты украінцаў у Галіцыі

ВАРШАВА, 12. З Львова паведамляюць, што ў радзе галіцыйскіх вёсак зроблены масавыя вобыскі і арышты украінцаў. У Тарнопале арыштавана шмат украінскіх гімназістых.

У вёсцы Нэзураў (каля Стрыя) выбухнула ў цэркве бойка, у часе якой быў забіты малады селянін. Калі ўлада захацела забраць труп для апатаманьня, сабраўся натоўп у некалькі тысяч сялян, якія супрацівіліся гэтаму. Прышлося выклікаць значныя паліцэйскія сілы з Стрыя. Арыштавана шмат сялян па абвінавачаньні ў супраціўленьні ўладзе. (ТАСС).

Рабочы рух

Пачалася забастоўка ў банку «Унітас» у Варшаве. Сакратар ўрэйскага саюзу гандлёвых і банкавых служачых Васэрман, які наведаў дырэкцыю банку для ўладжаньня канфлікту, арыштаваны. («Роб» № 133).

У сувязі з звальненьнем 4-х рабочых пачалася забастоўка на фабрыцы тормазаў Ясінскага і Дарынга ў Варшаве. Бастуючыя рабочыя накінулі мяшок на галаву тэхніку Э. Карасінскаму і вывезьлі яго ў тачцы за браму.

Рабочыя каналізацыі і водаправоду ў Варшаве пастанавілі дамагацца выплаты 50% месячнае зарплаты ў якасьці аднаразовае дапамогі ў адпаведнасьці з зробленаю выплатаю падобнае дапамогі іншым працаўніком гораду. У выпадку адмовы рабочыя пагражаюць забастоўкай.

Рабочыя запалковай манаполіі патрабуюць 20% павялічэньня зарплаты, палепшаньня гігіенічных абставіньняў, асабліва важных у запалковай прамысловасьці. («Роб.» № 137).

Пачалася забастоўка ў капальні нафты «Глінік» у Барыслаўлі. Рабочыя патрабуюць 50% надбаўкі.

У дзяржаўных тартаках у Чорнай Вёсцы бастуюць усе рабочыя.

На тартаку Голліцгэра ў Перамышлі пасьля трохтыднёвае забастоўкі рабочыя атрымалі 10% павялічэньня зарплаты.

Узрост беспрацоўя ў Чэнстахове

ВАРШАВА, 18. У Чэнстахове зачынеецца буйная ткацкая фабрыка «Чэнстаховянка». Без працы застанецца 5.000 рабочых. Ужо ад 15-га лютага 1928 г фабрыка працавала толькі 4 дні на тыдзень. («Роб.»).

Пашана кайзэра Вільгэльма ў Польшчы

ВАРШАВА, 19. Паліцыя Пазнанскага ваяводзтва арыштавала селяніна Выгоду, які напярэдадні вайны быў засуджаны нямецкімі судамі на 3 месяцы турмы за абразу Кайзара Вільгельма, але ў сувязі з пачаткам вайны не адсядзеў кары. Арыштаваны селянін быў засуджаны ў турму на Вронках і толькі пасьля адбыцьця тэрміну даведаўся, за што ён сядзеў. («Жэчп.»).

БЭРЛІНСКІЯ РАБОТНІЦЫ Ў ПЕРШАМАЙСКІХ ПАДЗЕЯХ

У арганізаваным першамайскім пратэсьце бэрлінскага пралетарыяту супроць капіталістычнага ладу ў Нямеччыне работніцы прынялі самы актыўны і гарачы ўдзел. У ва многіх мясцох работніцы адыгрывалі нават арганізатарскую ролю, першыя фармавалі дэманстрацыі, абаранялі ад захопу паліцыяй чырвоныя сьцягі і г. д. Паданыя ніжэй факты зьяўляюцца пяпоўнай зводкай, паводле нямецкіх газэт, удзелу работніц у першамайскіх падзеях у Бэрліне.

У Шёнбэргу—аднэй з частак Бэрліну—група рэвалюцыйна настроеных рабочых сабралася каля рынку, але дэманстрацыя яшчэ не пачыналася. Раптам чатыры работніцы выступілі наперад. Адна з іх разгарнула чырвоны сьцяг. У некалькі хвілін сфармавалася стройная дэманстрацыя на чале з адважнымі работніцамі. Не прайшлі дэманстранты і некалькі кварталаў, як насустрэч ім паказаліся паліцэйскія самаходы, якія з усяго разгону ехалі проста па дэманстрацыю. Работніцы з чырвоным сьцягам не адступілі ні на крок. Паліцэйскія спынілі самаходы і з гумовымі палкамі накінуліся на дэманстрантаў. Дзьве работніцы былі арыштаваны.

У Марыендорф-Тэмпэльгофе (адным з прадмесьцяў Бэрліну) паліцыя з самай раніцы была ўжо расстаўлена на вуліцах і не давала фармавацца дэманстрацыям. Рабочыя і работніцы сабраліся ў закрытых памяшканьнях і групамі сталі выходзіць на тратуары. Раптам па сыгналу яны з тратуараў зышлі на сярэдзіну вуліцы і заспялі «Інтэрнацыянал». Такое рантоўна сфармаваньне дэманстрацыі прывяло паліцыю на кароткі час у замяшаньне. Але падае каманда і паліцэйскія з гумовымі палкамі накідваюцца на безабаронных рабочых і работніц. У гэтай дэманстрацыі шмат работніц былі ў самых першых радох. Калі дэманстрацыя была ўжо разагнана, адна маладая работніца выскачыла на сярэдзіну вуліцы з выгукамі: «Наперад, на дэманстрацыю, на вуліцу». Вакол яе зноў сабралося шмат дэманстрантаў. Зноў былі пушчаны гумовыя палкі паліцэйскіх. Работніца была арыштавана, але нават акружаная паліцыяй яна крычала: «Няхай жыве 1-ае мая! Няхай жыве Камуністычная партыя».

У Ліхтэнбэргу работніцы сталі на чале паходу. Калі яны разгарнулі чырвоны сьцяг, хутка за імі вырасла вялікая калёна дэманстрантаў.

У цэнтры гораду работніцы ўтварылі асобную групу ў агульнай дэманстрацыі са сьцягам, які меў надпіс: «Роўная зарплата за роўную работу». Цэргібэляўская паліцыя, разганяючы дэманстрацыю, асабліва старалася адабраць ад жанчын іх сьцяг, але бяз посьпеху. Шмат работніц было пабіта гумавымі палкамі, шмат арыштавана, але сьцяг у паліцэйскіх рукі не папаў.

У Кёпэнніку работніцы таксама ішлі на чале паходу з чырвоным сьцягам. Калі паліцыя са зброяй напагатове перагарадзіла дарогу, работніцы не адступілі. З іх радоў панесьліся выгукі: «Стрэляйце, калі маеце адвагу на гэта». Паліцэйскія спачатку ня ведалі, што рабіць, а потым накінуліся на жанчын з гумавымі палкамі.

У Вэдынгу, адным з найвялікшых рабочых кварталаў Бэрліну, удзел работніц быў асабліва шматлікім. Тысячы работніц іншлі ў калёнах за чырвоным сьцягам. Пробы паліцыі захапіць яго скончыліся няўдачай. Тагды паліцыя нацкавала на работніц вялікіх паліцэйскіх сабак. Шмат удзельніц дэманстрацыі было пакусана. Калі пачалося будаваньне першых барыкад, жанчыны таксама прынялі ў гэтым актыўны ўдзел. У далейшым, калі паліцыя ад гумавых палак перайшла да кулямётаў і бронямашын, калі пачалі падаць забітыя і параненыя, дык работніцы горача ўзяліся за наладжаньне рабочае санітарнае дапамогі. Часта пад градам куль зьяўляліся яны каля барыкад, каб забраць параненага і, адцягнуўшы яго пад прыкрыцьцё выступу якое-небудз

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ПАРТЫЯ ПРЫСТУПАЕ ДА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ СВАІХ РАДОЎ

Надыходзячая чыстка павінна высьветліць наколькі кожны камуністы здольны змагацца за справу ленінізму і перамагаць цяжкасьці сацыялістычнага будаўніцтва

Задачы чысткі і праверкі ў вайсковых парт'ячэйках

Артыкул члена ЦКК УсеКП(б) і прадстаўніка камісіі ЦКК па праверцы кіруючага складу партыйных арганізацый БВА т. РАДУС-ЗЯНЬКОВІЧА

Перад вайсковай ячэйкай стаяць, перш за ўсё, ва ўсёй сваёй сіле тыя задачы і патрабаваньні, якія партыя паставіла перад сабою ў адносінах прагляду і чысткі сваіх радоў.

І для вайсковай ячэйкі праверка і чыстка павінна зьявіцца аглядам партыйнай работы, праверкай выкананьня партыйных дырэктыў і якасьці работы.

І для вайсковай ячэйкі праверка і чыстка павінна быць зьвязана з прыцягненьнем да партыі, **з вярбоўкай у яе тых рабочых, батракоў, беднякоў, якія, знаходзячыся ў Чырвонай арміі, не ўваходзяць яшчэ ў партыйную, а часамі нават і ў камсамольскую арганізацыю.**

І для вайсковай ячэйкі праверка і чыстка павінна зьявіцца повадам **да шырокай папулярызацыі задач** сацыялістычнага будаўніцтва.

І для вайсковай ячэйкі зьяўляецца абавязковым вялікае ўдакладненьне гэтых задач прыстасоўна да асобных галін будаўніцтва і да асобных умоў складу тэй ці іншай вайсковай часьці, тэй або іншай мясцовасьці, да тых або іншых спэцыяльных задач.

Трэба памятаць, што для партыі праверка і чыстка зьяўляецца не кампаніяй, а вялікай па сваім значэньні чарговай работай, ад ступені выкананьня якое залежыць тое, у якой меры будуць выконвацца пляны вялікіх работ, пастаўленыя партыяй перад сабою ў форме пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Чыстка і праверка партыі павінны ўзмацніць цягу ў партыю рабочай, батрацкай, беднякоўскай часткі чырвонаармейцаў. Чыстка партыі павінна дапамагчы ўмацаваць работу партарганізацый, праверыць работу кожнай ячэйкі, стварыць больш здаровыя, таварыскія адносіны ўнутры ячэйкі і ўмацаваць давер'е да партарганізацыі, аўтарытэт яе сярод чырвонаармейскіх мас і начскладу, павысіць якасьць работы з беспартыйным актывам.

Чыстка павінна павысіць **пачуцьцё адказнасьці кожнага партыйца, дапамагаць падняцьцю ўзроўню палітведаў.** Чыстка павінна ўзмацніць барацьбу з бюракратызмам і іншымі скажэньнямі, павінна павысіць актыўнасьць кожнага члена партыі і ўсёй партарганізацыі ў цэлым. Чыстка павінна завастрыць і павысіць **здольнасьць ячэйкі** своячасова выяўляць непадрэ[illegible]ўмела **папярэджваць** самую магчы[illegible]ьць іх. Чыстка павінна завастрыць увагу партарганізацый на задачах рашучага адпору клясава-чужым і кулацкім уплывам і жаданьням і пастаноўкі адпаведнай растлумачальнай работы.

Чыстка павінна даць праверку таксама **правільнасьці кіраўніцтва** ячэйкі, **правільнасьці партыйнага** кіраўніцтва ва ўсіх галінах партыйнай работы. Чыстка павінна прымусіць партыйцаў вынесьці раскошу, **ударыць самым рашучым чынам па бытавым загніваньні.** Чыстка павінна ўзмацніць і замацаваць сувязь партыйнай работы ў Чырвонай арміі з агульнай партыйнай работай. **Чыстка павінна загартаваць партарганізацыю Чырвонай арміі ў барацьбе з ухіламі ад правільнай партыйнай лініі, ці будзе гэта праяўленьнем трацкізму ці апартуністычнага правага ўхілу.**

У вайсковай ячэйцы ёсьць таксама асобныя задачы. Вайсковая ячэйка зьяўляецца бліжэйшай і абавязковай дапаможніцай камскладу і палітскладу ў ажыцьцяўленьні спэцыяльных задач Чырвонай арміі і выкананьні дырэктыў ЦК УсеКП(б), ПУР'у і РВС. Побач з асноўнай задачай праверкі і чысткі радоў партарганізацыі і павышанага ўцягненьня ў партыю рабочых, батракоў і беднякоў,—вайсковыя ячэйкі павінны праверыць стан і падняць якасьць сваёй работы ў галіне павышэньня вайсковай падрыхтоўкі, ўмацаваньня вайсковай дысцыпліны, узмацненьня баяздольнасьці, павышэньня палітычнага ўзроўню актыўнасьці чырвонаармейцаў.

У адносінах праўленьняў бюракратызму, няўважлівасьці, часамі грубасьці, разгільдзяйства, адрыву аддзельных асоб з начскладу ад чырвонаармейскай масы, невыстарчальнае ўвагі да скаргаў чырвонаармейцаў, да расьсьледваньня ваенкораўскіх заметак, да выяўленьня асобных праяўленьняў «очковтирательства» і да барацьбы з ім, пастаноўкі выкрываючай работы ў насьценных газэтах і ў агульным чырвонаармейскім друку, у адносінах выпадкаў простага зажыму самакрытыкі, прасьледваньня крытыкуючых, спроб часамі адміністрацыйнага зьвальнічаньня на сакратароў ячэек з чырвонаармейцаў і малодшага камскладу і інш., ва ўсіх гэтых адносінах і ва ўсім штодзённым жыцьці Чырвонай арміі і любой яе часьці вайсковая ячэйка і кожны партыец павінны даваць прыклад вытрыманасьці, сьвядомасьці, актыўнасьці, ініцыятывы і ўмелага адпору ўсім спробам скажаць партыйную работу і здаровыя адносіны ўнутры часьцей Чырвонай арміі.

Чыстка і праверка радоў партарганізацыі павінны **ўзьняць узровень крытыкі і самакрытыкі,** забясьпечваючы разам з тым прыцьцішовы і здаровы характар яе, вольны ад дробязных прычэпак, ад спроб зводзіць асабістыя разрахункі, калупацца ў дробязях быту. Пры гэтым, зразумела, небясьпека спроб зводзіць асабістыя рахункі ні ў якім выпадку не павінны прыніжаць **узровень здаровых патрабаваньняў начскладу, якія паложаны па статуце, не павінны паслабляць патрабаваньняў дысцыпліны.**

Пры праверцы скаргаў, заметак-заяў трэба ўлічыць магчымасьць скарыстаньня чысткі і праверкі ў мэтах зьвядзеньня асабістых рахункаў склочнікамі і тымі, што падрываюць дысцыпліну, і заведама неўгрунтаваных абвінавачаньняў начскладу ў сувязі з настойлівымі патрабаваньнямі яго наконт вайсковай дысцыпліны і падтрыманьня ўстаноўленага парадку ў казарменым быце.

Пры скліканьні адкрытых партсходаў трэба загадзя прыняць адпаведныя меры да таго, **каб забясьпечыць магчыма шырокае прыцягненьне на гэтыя сходы беспартыйных чырвонаармейцаў і каманднага складу, асабліва з актыву іх.**

Арганізуючы прыём вусных і пісьмовых заяў і скаргаў у сувязі з праверкай і чысткай, трэба прадугледжваць магчымасьць асобных выпадкаў устрыманьня ад падачы цэнных заяў з-за боязьні дысцыплінарных спагнаньняў за гэта пасьля чысткі. Таму скрыні для заяў павінны знаходзіцца пад непасрэдным ведамам праверкомаў. Члены праверкомаў павінны прымаць таксама непасрэдна асобныя вусныя і пісьмовыя заявы. Пры праверцы заяў трэба надзвычайна асьцярожна падыходзіць да агалашэньня прозьвішчаў падаўшых заявы.

Нельга пералічыць усіх труднасьцяй праверкі ў адносінах вайсковых ячэек. Можна толькі лішні раз раіць **вялікую асьцярожнасьць, абавязковасьць уважлівага, удумлівага падыходу і ацэнкі ўсіх асабліва сьцяй, абавязковасьць цярплівага і падрабязнага растлумачэньня ўсіх сумненьняў, што ўзьнікаюць у асобных кандыдатаў і членаў партыі, хістаньняў, улічваючы пры гэтым мінулае і ранейшую работу.** Напрыклад, пры ўстанаўленьні дробных партпраступкаў у чырвонаармейцаў з рабочых і сялян, трэба ўлічыць тэрмін прабываньня іх у часьцях Чырвонай арміі, ступень прыстасаваньня да ўмоў казарменага быту, уплыву, адрыву ад сямейных умоў і інш. У адносінах, напрыклад, камскладу, што прышоў з старой арміі трэба прымаць пад увагу баявыя заслугі ў часе грамадзянскай вайны і інш.

У той-жа час трэба памятаць, што ва ўмовах казарменага быту такія праступкі, **як бытавое загніваньне, сувязь з чужым элемэнтам, склока і п'янства, маюць асабліва шкодны характар і патрабуюць рашучага падыходу пры праверцы і чысткі.**

Віцебская арганізацыя КП(б)Б напярэдадні чысткі

(НА АБ'ЯДНАНЫМ ПЛЕНУМЕ ВІЦЕБСКАГА АК І АКК КП(б)Б)

Аб'яднаны пленум ВІЦЕБСКАГА АК і АКК КП(б)Б, які скончыўся на мінулым тыдні, падвёў вынікі праведзенай работы па падрыхтоўцы да чысткі па Віцебскай акруговай партарганізацыі.

Пленум адзначыў, што пытаньні чысткі абгавораны ва ўсёй партарганізацыі, на гарадзкіх актывах, райпартсходах, парт'ячэйках, на вытворчасьці, па ўстановах, вясковых ячэйках і райкомах. Партарганізацыя аднадушна пацьвердзіла неабходнасьць праверкі і чысткі партыі ад сацыяльна чужых элемэнтаў, бюракратаў і тых, што разлажыліся і прымазаліся. Адначасова з гэтым пленум адзначыў, што арганізацыйна-ідэёвая падрыхтоўка да праверкі і чысткі арганізацыі, ня гледзячы на рад дырэктыў, праходзіць марудна, а ў некаторых мясцох нават нездавальняюча (Мяжанскі і Пралетарска-Слабодзкі райком КП(б)Б). Складаньне характарыстык па ячэйках праходзіла пры недастатковай увазе і кіраўніцтве з боку раённых камітэтаў КП(б)Б.

Райкомы зусім мала зьвярталі ўвагі на вывучэньне асаблівасьцяй работы парт'ячэек. Не разгорнута работа па мабілізацыі партыйна-грамадзкай думкі наўкола пытаньняў надыходзячай чысткі.

Ідэёва-палітычная падрыхтоўка беспартыйных рабочых і працоўнага сялянства, асабліва батрацтва і беднаты, да праверкі і чысткі партыі праходзіць таксама невыстарчальна. У вясковых і савецкіх парт'ячэйках з боку некаторай часткі партыйцаў наглядаецца замкнутасьць і боязьнь выявіць свае недахваты (парт'ячэйка гуты «Ноўна» і інш.). У вытворчых ячэйках сярод асобных партыйцаў ёсьць шкодная настрої скарыстаць чыстку партыі для націску на гаспадарнікаў, што ў выніку вядзе да паслабленьня працоўнай дысцыпліны (ячэйкі фабрыкі акуляраў, Вітшэві, Мэтпром і інш.).

Асобныя арганізацыі імкнуцца перанесьці галоўную ўвагу на пытаньні бытавога характару замест праверкі правядзеньня асобнымі партыйцамі правільнай партыйнай лініі, ідэалёгічнай вытрыманасьці і г. д.

На праведзеных партсходах была шырока разгорнута крытыка хваравітых зьявішч у партарганізацыі.

Пытаньне чысткі не атрымала яшчэ да гэтага часу належнага асьвятленьня ў акруговай газэце «Заря Запада» і амаль што зусім не асьвятлялася ў насьценных і друкаваных заводзкіх газэтах. Слаба ўцягнуты ў гэтую работу рабкоры, селькоры і насьценкоры.

Пленум прапанаваў ўсім РК КП(б)Б прыняць належныя меры да больш шырокага і поўнага азнаямленьня беспартыйных рабочых мас, батрацтва і беднаты з задачамі праверкі і чысткі радоў партыі. Адкрытыя сходы парт'ячэек з шырокім удзелам беспартыйных рабочых, батракоў, беднякоў і сераднякоў, павінны служыць поўнай праверкай работы і становішча асобных ячэек і асобных партыйцаў і скарыстаньнем гэтых сходаў для ўцягненьня рабочых, асабліва з вялікім вытворчым стажам, у партыю.

Павінна быць значна больш разгорнута ў друку і асабліва ў насьценных і друкаваных газэтах на прадпрыемствах і установах асьвятленьне задач праверкі і чысткі партыі і выяўленьне момантаў некамуністычных паводзін асобных партыйцаў, што дыскрэдытуюць партыю.

Райкомам КП(б)Б, якія да гэтага часу яшчэ не склалі характарыстык на свае ячэйкі і арганізацыю ў цэлым, пленум прапанаваў зараз-жа скласьці характарыстыкі з поўным адлюстраваньнем становішча раённай партарганізацыі і парт'ячэек. Пленум прызнаў неабходным узмацніць інструктаваньне і жывое кіраўніцтва райкомаў і ячэек з боку бюро АК і прэзыдыуму АКК і аказаць практычную дапамогу ім у справе падрыхтоўкі да праверкі і чысткі партыі.

Эм.

Зрываюць калектывізацыю

Падкулачнікі з партбілетамі агітуюць супроць калгасаў

(Чэрвенская арганізацыя КП(б)Б)

У Чэрвенскую арганізацыю КП(б)Б пад шыльдай сялян-беднякоў пралезьлі заможнікі і падкулачнікі, якія дыскрэдытуюць партыю і адкрыта выступаюць супроць яе палітыкі.

Партыя—за калгасы, яны—за моцную заможную гаспадарку. Для гэтых «камуністых» партбілет—толькі сродак для ўзмацненьня сваёй гаспадаркі. Прыкладаў можна падаць шмат.

Член партыі **Калтовіч,** заможны сераднік, пераехаўшы ўвесь час прыказчыкам Горкаўскага спажывецкага таварыства, адкрыта выступіў супроць арганізацыі калгасу. Наогул Калтовіч, як падкулачнік, зьяўляецца характэрным тыпам. Працуючы ў мясцовым каапэратыве Калтовіч выдаткоўваў дэфіцытныя тавары толькі кулакам. Такія паводзіны Калтовіча выклікалі абурэньне ўсёй навуковай беднаты.

Ня дзіва, што на сходзе, дзе стаяла пытаньне аб арганізацыі калгасу, Калтовіч выступіў супроць яго арганізацыі. Кулацтва добра скарыстала адкрытае выступленьне «камуністага» супроць калектывізацыі. Арганізацыя калгасу была сарвана.

Партыец **Тарасік** таксама выступіў супроць арганізацыі калгасу. Зразумела, што сын кулака інакш паступіць ня мог. Бацька Тарасіка—буйны кулак, мае 25 дзесяцін зямлі. Сам Тарасік трапіў у партыю пад шыльдай рабочага: пайшоў у горад, дзе ўдала пралез на вытворчасьць і потым прымазаўся да партыі.

Член партыі **Гранчык,** працуючы ў раёне лясьніком, не выступаў супроць калгасу. Ён зрабіў лепш. У мінулым Гранчык быў членам сельска-гаспадарчай камуны. Аднак, праз нейкі час з калгасу выйшаў і пачаў самастойна займацца гаспадаркай. Зараз Гранчык апрацоўвае 12 дзесяцін зямлі. Ніякіх прычын для выхаду з калгасу ў Гранчыка ня было. Райком КП(б)Б некалькі раз прапанаваў Гранчыку ўступіць у калгас але...

Гранчык і на сенешні дзень працуе на сваёй гаспадарцы, якая знаходзіцца побач з камуной.

Мы павінны рашуча выкрываць тых камуністых, якія зрываюць калектывізацыю.

Трэба добра памятаць, **што адмаўленьне ісьці ў калгас несумяшчальна з прабываньнем у партыі.**

Гранчыку, Тарасіку, Калтовічу ў партыі ня месца.

А. Ю.

Выезд 50 камуністых—адказных працаўнікоў на работу ў вёску

Менскі АК КП(б)Б паслаў на работу ў вёску 50 камуністых—цэнтральных і акруговых працаўнікоў. Узмацненьне работы нізавых партыйных, савецкіх і каапэрацыйных арганізацый, практычная дапамога вясковым парторганам у правядзеньні чысткі партыі і савецкага апарату і папулярызацыя сярод беднаты і сераднятва асноўных настаноў партыі—вось тыя задачы, што стаяць перад таварышамі, накіраванымі ў вёску.

Т. т. будуць працаваць у вёсцы каля 2 месяцаў.

Усе працаўнікі, накіраваныя ў вёску, забясьпечаны літаратурай і адпаведнымі інструкцыямі.

Сёньня гэтыя таварышы выяжджаюць ва ўсе раёны Менскае акругі.

Часопісь практычнага вопыту партработы

(Да выданьня часопісі «Весткі ЦК КП(б)Б»)

Патрэба ў выданьні партыйнае часопісі, якая магла-б арганізаваць сыстэматычны ўлік і абмен практычным вопытам арпартработы ў нас у КП(б)Б даўно назрэла. З кожным годам усё ўскладняюцца задачы партработы, больш складанымі і рознастайнымі становяцца яе формы і мэтады. На мясцох, у нізавых арганізацыях накапляецца багатая практыка партработы.

Але да гэтага часу амаль зусім не наладжана работа па вывучэньні гэтае практыкі, нярэдка тое або іншае ўдалае пачынаньне арганізацыі ці ячэйкі застаецца ўласнасьцю толькі яе адной, не пераносіцца ў другія арганізацыі.

Выданьне «Вестак ЦК КП(б)Б» у значнай меры палегчыць вырашэньне гэтай задачы.

Побач са зьмяшчэньнем кіруючых матар'ялаў па пытаньнях арпартработы, асноўная ўстаноўка часопісі—**на арганізацыю абмену практычным вопытам работы.** Цэнтральнае месца ў часопісі вызначаецца **для прапрацоўкі пытаньняў аб новых формах арганізацыйнай і партыйна-масавай работы, для асьвятленьня практыкі работы мясцовых арганізацый.**

Асьвятляючы ўдалую практыку нізавых арганізацый, часопісь будзе дапагаць больш **хуткаму прыстасаваньню яе ў рабоце ўсёй КП(б)Б,** з другога боку, крытыкуючы недахваты і памылкі ў рабоце тэй або іншай партарганізацыі, будзе **папярэджваць паўтарэньне гэтых памылак у рабоце ўсіх іншых.**

Вялікае значэньне мае зьмяшчэньне ў часопісі інфармацыйнага матар'ялу аб рабоце ЦК і яго аддзелаў і апублікаваньне важнейшых пастаноў ЦК. Да гэтага часу рэзалюцыі ЦК даходзілі ў лепшым выпадку да сакратара РК ці ячэйкі. Зьмяшчэньне рэзалюцый ЦК у часопісі палягчае для ўсёй партмасы магчымасьць карыстацца імі, як кіруючым матар'ялам у штодзённай рабоце.

Такім чынам «Весткі ЦК КП(б)Б» зьяўляюцца патрэбным кіруючым падручнікам у штодзённай практычнай рабоце ўсяго партыйнага актыву.

Устаноўка на **арганізацыю абмену практычным вопытам** патрабуе стварэньня вакол «Вестак ЦК КП(б)Б **шырокай сеткі партыйных карэспандэнтаў,** патрабуе самага актыўнага ўдзелу партыйнага актыву ў асьвятленьні на старонках часопісі практыкі работы сваёй ячэйкі, РК ці арганізацыі. Толькі пры гэтай умове часопісь здолее выканаць асноўную задачу—**быць трыбуналам мясцовае практыкі.**

У практыцы партработы ў нас за апошні час пачынае ўжывацца рад новых форм: **арганізацыя зьменных ячэек, ліквідацыя сям-там бюро агульназаводзкіх калектываў, арганізацыя цэхпрафработы, пашырэньне праў парт'ячэек, сельрайкомаў.** Трэба, каб работнікі мясцовых арганізацый на старонках часопісі падзяліліся сваёй практыкай у правядзеньні гэтых мерапрыемстваў.

Акрамя таго, зараз яшчэ ня поўнасьцю вырашаны на практыцы такія праблемы, як: перанясеньне цэнтру цяжару работы ў цэх, удакладненьне арганізацыйных форм масавай работы на прадпрыемствах і г. д. Гэтыя пытаньні павінны быць магчыма поўна асьветлены таварышамі з месц.

Практычнае ажыцьцяўленьне лёзунгу самакрытыкі, практыка кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём прадпрыемстваў, практыка работы з беднатой, работа на калектывізацыі сельскае гаспадаркі, партработа ў калгасах і саўгасах, падрыхтоўка і правядзеньне чысткі партыі, пастаноўка работы па вярбоўцы рабочых у партыю,—вось прыкладна галоўнейшыя пытаньні, па якіх трэба пісаць у часопісь.

Пры актыўным удзеле партыйнага актыву «Весткі ЦК КП(б)Б» бясспрэчна адыграюць вялікую ролю ў справе паляпшэньня практыкі партработы.

І. ДОРАХАЎ.

Партыйная хроніка

У МенАК КП(б)Б

Курсы па падрыхтоўцы рабочых-прапагандыстых

Пры МенАК КП(б)Б з 15 чэрвеня адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы рабочых-прапагандыстых.

Праграма курсаў разьлічана на 6 тыдняў. На курсы будуць прыняты 62 гарадзкія і с.-гаспадарчыя рабочыя.

Ад'езд тав. Славінскага ў Маскву

Сакратар МенАКрускому КП(б)Б тав. СЛАВІНСКІ выехаў у Маскву на Усесаюзны Зьезд Саветаў. На час адсутнасьці тав. Славінскага выкананьне абавязкаў сакратара АК усклядзена на тав. ЦЭНЦЫПЭРА.

Пасылка ў Інстытут Усходазнаўства

Менакругком атрымаў некалькі месц у Інстытуце Усходазнаўства ў Маскве. АК прыступіў да вярбоўкі кандыдатур для пасылкі ў гэты інстытут.

***

АК камандыруе ў Маскву 4 чалавек на вўрэйонія прапагандысцкія курсы.

На курсы пасылаюцца выключна рабочыя з вытворчасьці. АК таксама пасылае некалькі чалавек у Гомельскую вўрэйскую партшколу.

Хто каго

Гэта пытаньне паставіў тав. Ленін перад партыяй і рабочай клясай нашай краіны яшчэ ў 1921 годзе. Хто каго гаспадарча пераможа: пралетарыят буржуазію ці буржуазія пралетарыят? У вайсковых адносінах пралетарыят аказаўся дужэйшым за буржуазію і нашчэнт разьбіў яе ў грамадзянскай вайне. Але ці здолее ён таксама арганізаваць перамогу і на эканамічным фронце?

Пытаньне хто каго ў адносінах да ўнутраной буржуазіі вырашана для пралетарыяту ў станоўчым сэнсе. Рост сацыялістычных элемэнтаў у прамысловасьці і гандлі за апошнае пяцігодзьдзе ішоў так шпарка, што яны выпіхалі прыватны капітал з усіх рапаючых пазыцый. За апошнія гады буйныя посьпехі зрабіў сацыялістычны сэктар і на вёсцы. Барацьба яшчэ ня скончана, барацьба працягваецца і чым далей, тым у больш абвостраных формах. Але перавага вызначыла яўна на баку пралетарыяту і гэта вырашае выпік барацьбы з рэшткамі капіталізму ў нас у краіне. Далейшае наступленьне на кулацкія капіталістычныя элемэнты і ўзмоцненае будаўніцтва калгасаў і саўгасаў, прадпрынятае партыяй, гарантуе нам гэту перамогу.

Але пытаньне **хто каго** ў такой-жа меры прыстасоўны і да барацьбы пралетарыяту з міжнародным імпэрыялізмам. Калі поўны правал атрымала тое, што яны ўварваліся ў нашу краіну, дык ці ня ўдасца ім задушыць нас эканамічна, пераважаю свайго багацьця? А між тым ясна, што сацыялізму нельга пабудаваць не пабіўшы міжнароднае буржуазію і на гаспадарчым фронце.

Наконт гэтага ёсьць дзьве розныя думкі. У свой час трацкістыя сьцьвярджаюць, што мы знаходзімся пад кантролем капіталістычнае сусьветнае гаспадаркі і вырвацца з яе моцных лап ня здолеем. Адсюль яны рабілі вывад аб немагчымасьці пабудаваньня сацыялізму ў нашай краіне, а значыць і аб немагчымасьці перамагчы сусьветную буржуазію на гаспадарчым фронце.

Сучасная правая апазыцыя падыходзіць да гэтае справы таксама інакш, чым партыя. Правая апазыцыя крычыць: «лягчай на паваротах; трэба паменшыць тэмп індустрыялізацыі, інакш мы сарвемся і ня вытрымаем прынятага напружаньня». Па сутнасьці справы правая апазыцыя таксама ня верыць у творчую здольнасьць пралетарыяту, ня верыць у пабудаваньне сацыялізму ў нашай краіне і таму патрабуе адачы пазыцый дробна-буржуазным элемэнтам краіны.

Акрамя адкрыта і яскрава выяўленага правага апартуністычнага ўхілу, ёсьць яшчэ і сумняваньня, абываталькія разважаньні. Іх разважаньні зводзяцца да таго, што куды, моў, нам сунуцца з суконным рылам ды ў калашны рад. «Куды нам—недаверліва заяўляюць яны—цягацца з багатай Амэрыкай, дзе амаль кожны жыхар на аўтамабілі езьдзіць, а ў нас і худых кляч не хапае. Хлеба няма, на 12- годзе рэвалюцыі фунт па картцы атрымліваем, а туды-ж: перагонім Амэрыку!». Так разважаюць абываталькія элемэнты.

Усе гэтыя разважаньні з розных канцоў і парознаму прасочваюцца ў асяродзішча пралетарыяту і падточваюць энэргію яго найменш вытрыманых і загартаваных пластоў. Практыка апошніх год цалкам і поўнасьцю абвяргае гэтыя прадраканьні ныцікаў усіх гатункаў і колераў, таксама як і заведама недарэчныя, нібы «навуковыя» прадраканьні буржуазных спэцыялістых.

Вось што гавораць лічбы, намечаныя па пяцігадовым плане. За кораткасьцю месца тут бярэцца толькі тры **раашаючыя** галіны нашай прамысловасьці: вугаль, сталь, электрыфікацыя. Іменна разьвіцьцё гэтых галін будзе паказальнікам таго, наколькі краіна індустрыялізавалася і наблізілася да перадавых капіталістычных краін Эўропы і Амэрыкі.

У 1928 г. было здабыта каменнага вугалю.

1) У Амэрыцы — 516 млн. тон
2) У Англіі — 241 млн. тон
3) У Нямеччыне — 150 млн. тон
4) У Францыі — 52 млн. тон
5) У СССР — 35 млн. тон

У 1933 г. будзе здабыта каменнага вугалю.

1) У Амэрыцы — 542 млн. тон
2) У Англіі — 253 млн. тон
3) У Нямеччыне — 173 млн. тон
4) У СССР — 75 млн. тон
5) У Францыі — 67 млн. тон

У 1928 г. мы стаім на 5 месцы і здабываем вугалю ў 4 разы менш Нямеччыны, у 7 раз—Англіі і амаль у 15 раз менш Амэрыкі. Але праз пяць год розьніца паміж намі і капіталістычным сьветам ужо **памяншаецца у два разы.** У 1933 г. мы стаім на 4 месцы, і здабываем вугалю менш Нямеччыны ў 2 в палов. разы, Англіі ў 3 в палов. разы і ў 7 раз менш Амэрыкі.

Але яшчэ больш важна адзначыць, што па прыросьце прадукцыі мы стаім на першым месцы і абганяем нават Амэрыку. Так прырост здабычы вугалю за 5-цігодзьдзе ў нас складае 40 мільёнаў тон, у Амэрыцы ўсяго 26 мільёнаў тон, а ў іншых краінах і таго менш:

У 1928 г. было выпрацавана сталі.

1) У Амэрыцы — 50 млн. тон
2) У Нямеччыне — 14 млн. тон
3) У Францыі — 9 млн. тон
4) У Англіі — 8 млн. тон
5) У СССР — 4 млн. тон

У 1933 г. будзе выпрацавана сталі.

1) У Амэрыцы — 56 млн. тон
2) У Нямеччыне — 18 млн. тон
3) У Францыі — 13 млн. тон
4) У СССР — 10 млн. тон
5) У Англіі — 9 млн. тон

Па выпрацоўцы сталі мы бачым такі-ж малюнак росту СССР, як і па здабычы вугалю. У 1928 г. СССР стаіць на 5 месцы і выпрацоўвае сталі ў 2 разы менш Англіі і Францыі, у 3 в палов. разы менш Нямеччыны і ў 12 в палов. раз менш Амэрыкі. Але справа рэзка зьмяняецца па сканчэньні 5 год. СССР становіцца на 4-е месца і выбраўшы сталі ў 5 в палов. раз менш Амэрыкі, г. зн. і тут розьніца паміж СССР і капіталістычным сьветам **паменшылася больш, чым у два разы.** Як і па вугалі, па прыросьце сталі СССР стане на першае месца, выпярэджваючы і тут Амэрыку. Іменна большы прырост прадукцыі ў СССР, чым у іншых краінах, і гаворыць за тое, што мы дагонім і перагонім Злучаныя Штаты Амэрыкі.

Нарэшце, здабыча электраэнэргіі павялічыцца ў СССР у 4 в лішнім разы, з 5 мільярдаў кілёват-гадзін у 1928 г. да 22 мільярд. у 1933 г. У Нямеччыне рост электраэнэргіі паднімецца з 13 да 18 мільярдаў, а ў Амэрыцы з 83 да 122 мільярдаў кілёват-гадзін. Такім чынам, па росьце электрыфікацыі СССР выпярэджвае Нямеччыну і застаецца толькі ззаду Амэрыкі. Але і ў гэтым выпадку розьніца скарачаецца вельмі значна. У 1928 г. па колькасьці электраэнэргіі СССР адставаў ад Амэрыкі ў 16 в палов. раз, у 1933 г. гэта адставаньне будзе паменшана да 5 в палов. раз, г. зн. у 3 разы,—больш чым па іншых галінах.

Але праграма вялікіх работ па сацыялістычным перабудаваньні нашай краіны можа быць выканана пры ўмове дружнай і энэргічнай работы ўсяго пралетарскага калектыву. У момант вялікіх творчых намаганьняў рабочае клясы зьяўляюцца шкодныя і дэзарганізуюча ўплываюць усякія хістаньні і ваганьні ў радох авангарду гэтае клясы. Таму патрэбен суровы адпор і бязьлітасная барацьба з правым ухілам, які процістаўіць лініі партыі сваю апартуністычную тэорыю аб здачы пазыцый дробна-буржуазнай стыхіі. За правядзеньне пастаноў 16-й усесаюзнай партканфэрэнцыі, за правільную ленінскую лінію партыі, з дапамогаю якое толькі і можна ажыцьцявіць і ператварыць у жыцьцё вялікі плян пяцігадовых работ, партыя будзе змагацца з бальшавіцкай цьвёрдасьцю і непахіснасьцю.

А. П.

Дзікі антысэміцкі ўчынак у Жлобіне

(Па тэлефону ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

Нядаўна адбыўся агульны сход транспартных рабочых Жлобіну, на якім абгаворвалася пытаньне аб здзеках антысэміта Зарубы над 58-гадовым грузчыкам-яўрэям Стаўпнэрам. Заруба падаў абедзь, якія прыносіў з сабой Стаўпнэр і заварочваў замест іх у паперу дохлага вераб'я. Акрамя таго, Заруба біў Стаўпнэра ў вуха і прымушаў насіць яго непасільныя грузы. Калі аднойчы Стаўпнэр ад непасільнае ношы зваліўся з ног, то Заруба пачаў лаяцца і абзываць яго «жыдам». Заруба некалькі разоў пагражаў Стаўпнэру забойствам.

Такія здзекі над рабочым-яўрэям з боку Зарубы мелі месца ў працягу больш як году. Пра гэта ведаў кіраўнік грузчыкаў Журоўсні, але нікуды не паведамляў.

Толькі пасьля зьмяшчэньня заметкі ў насьценгазэце аб гэтых дзікіх учынках, справе быў даны ход.

Як выявілася на агульным сходзе, Заруба зьяўляўся антысавецкім элемэнтам, агітаваў рабочых супроць падпіскі на пазыку індустрыялізацыі, адгаворваў рабочых ісьці на сходы.

Сход транспартных рабочых пастанавіў выключыць Зарубу з саюзу і зьняць з працы. Зараз Заруба арыштаваны, і справа аб ім накіравана ў акруговую пракуратуру.

Габінэтны вучот аб'ектаў абкладаньня ў кулацтва

Бедната ня ўцягваецца ў справу вучоту аб'ектаў абкладаньня.—Нядбайныя адносіны да справы пагражаюць зрывам кампаніі

ВІЦЕБСК (наш кар.). Вучот аб'ектаў абкладаньня па Віцебскай акрузе праводзіцца пакуль што надзвычайна слаба. Пастуўшыя з раёнаў весткі паказваюць на шмат недахопаў у гэтай рабоце. Некаторыя сельсаветы складаюць сьпісы кулацкіх гаспадарак «габінэтным» спосабам, не абгаварваючы іх на сходах беднаты. З-за нядбайных адносін да сваіх абавязкаў, вучотныя камісіі далёка яшчэ ня выявілі ўсю ўтоеную зямлю і іншыя прыбыткі.

У Сураскім раёне на інструкцыйным сходзе старшынь і сакратароў сельсаветаў адсутнічалі прадстаўнікі райвыканкому; у Межынскім раёне на такім сходзе адсутнічалі прадстаўнікі 2 сельсаветаў.

Такія адносіны з боку нізавых арганізацый пагражаюць зрывам усёй работы па вучоце аб'ектаў абкладаньня, што ў сваю чаргу адаб'ецца і на сельгаспадатковай кампаніі.

Позна пачалі

Пытаньне аб чыстцы савецкага апарату ў маст. Вушачы, Полацкай акругі, толькі 21/IV 29 г. абмяркоўвалася на агульным сходзе парт'ячэйкі, на якім былі камсамольцы і беспартыйныя. Па дакладу разгарнуліся гарачыя спрэчкі, у якіх даводзілі, што ў савецкім апараце ёсьць шкодны элемэнт, які трэба гнаць з апарту. Асабліва спыняліся на спэцах-загатоўшчыках, у якасьці якіх працуюць па Вушацкім раёне амаль усе былыя гандляры, кантрабандыстыя, спэкулянты, якія толькі што кінулі гандляваць і ня маюць права голасу.

Зьвярнулі ўвагу на бюракратызм, які і ў Вушацкім РВК, у каапэрацыі, у РКСУ і іншых установах, дзе працаўнікі толькі адсылоюць сялян ад аднаго стала да другога, не даючы адказаў.

Адначалі, што зьнятыя пераходзяць з аднэй установы ў другую, як напрыклад: вушацкае спажывецкае таварыства зьняло загатоўшчыка Майміна, а ён перайшоў у крэдытнае таварыства.

Трэба адзначыць, што позна распачата падрыхтоўчая работа (толькі з 21/IV), а да гэтага часу ўсе спалі і цяпер гэта праца яшчэ не разгортваецца як трэба.

КРЫВЫ.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

па тэлеграфу, тэлефону і поштай ад нашых карэспандэнтаў

На асінаўскіх торпараспрацоўках



АСІНСТРОЙ. (Наш кар.). Скончаны працы па падрыхтоўцы да здабываньня торпу на Асінстрої. Набата 6 камплектаў торпамашын.

На торпараспрацоўках будзе занята каля 1.000 чал.

Для тарпянікаў абсталяваны добрыя баракі. На торпараспрацоўках ёсьць пакарня, каапэратыў і сталоўка. Для культурнага абслугоўваньня рабочых пабудаваны клюб, у якім працуюць гурткі па палітграмаце і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Два разы ў тыдзень ідуць кіно-карціны.

У гэтым сэзоне плянам прадугледжваецца здабыць 2 з пал. мільёны пудоў торпу.

Асінстрой без мэдыцынскага абслугоўваньня

ВОРША. (Наш кар.). Ня гледзячы на тое, што на Асінаўскім будаўніцтве занята шмат рабочых, там зусім дрэнна пастаўлена мэдыцынскае абслугоўваньне. Не хапае перавязачных сродкаў і мэдыкамэнтаў, а на торпараспрацоўках няма нават і доктара, хоць там працуе больш за тысячу чалавек.

Кіраўніцтва Асінстрою яшчэ ў мінулым годзе паставіла перад акруговым інспэктарыятам аховы здароўя аб гэтым пытаньне, але апошні пры складаньні бюджэту на ахову здароўя зусім зэбыў пра Асінстрой і доктара на распрацоўкі ня прыслаў. Такім чынам, дзякуючы галавацяпам з інспэктарыяту аховы здароўя, рабочыя застаюцца без мэдыцынскай дапамогі.

Сяўба ідзе поўным ходам

ВОРША. (Наш кар.). Сяўба ярыны на Аршанчыне—у поўным разгары, у некаторых мясцох сяўба ўжо канчаецца. У саўгасах, дзе ёсьць трактары, сяўба праводзіцца ў дзьве зьмены. Насеньнем саўгасы забясьпечаны цалкам, апрача вікі. Радавы пасеў

Шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва ў вёсцы

„Сацыялістычнае спаборніцтва—магутны сродак абуджэньня да арганізацыі ініцыятывы мас для выкананьня пяцігадовага пляну і разам з тым магутны сродак разьвіцьця самакрытыкі зьнізу“

(З АДОЗВЫ УСЕСАЮЗНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ УсеКП(б) ДА УСІХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН САВЕЦКАГА САЮЗУ)

НЕ ЧАРГОВАЯ КАМПАНІЯ,

—а сталы мэтад уцягненьня мас у сацыялістычнае будаўніцтва

Сацыялістычнае спаборніцтва, якое шырока разгарнулася ў горадзе паміж фабрыкамі і заводамі, зараз перакінулася і ў вёску. У горадзе па радзе прадпрыемстваў мы ўжо маем рад вынікай: у папяровай прамысловасьці за час спаборніцтва на радзе фабрык павялічылася вытворчасьць, зьменшыліся прагулы. Зьменшыўся сабекошт прадукцыі. Такія-ж факты мы паглядаем і ў іншых галінах прамысловасьці.

На вёсцы сацыялістычнае спаборніцтва толькі пачынае разгортвацца.

Сёньня «Зьвязда» прыступае да шырокага высьвятленьня на сваіх старонках сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы, у першую чаргу, у сацыялістычным сэктары сельскае гаспадаркі—у саўгасах і калгасах. Сёньня мы падаем першыя весткі з акруг Беларусі аб дагаворах па спаборніцтве паміж паасобнымі саўгасамі і калгасамі.

Але заключэньне гэтых дагавароў—толькі першая фаза сацыялістычнага спаборніцтва.

Далейшая задача і самая галоўная, гэта—**арганізацыя фактычнай праверкі ходу сацыялістычнага спаборніцтва, высьвятленьня першых вынікаў і дасягненьняў паасобных калектываў, каб падзяліцца практыкаю гэтых дасягненьняў усёй савецкай грамадзкасьцю вёскі.**

Тут на дапамогу друку павінны прыйсьці селькоры, вясковыя актывісты і радавыя працаўнікі саўгасаў і калгасаў, паведамляючы аб ходзе спаборніцтва і яго выніках у нашу газэту.

Але пры гэтым трэба памятаць, што сацыялістычнаму спаборніцтву ні ў якім разе пя трэба надаваць характар кампаніі. Спаборніцтва павінна стаць сталым мэтадам уцягненьня мас у сацыялістычнае будаўніцтва.

Адзначаючы дасягненьні паасобных саўгасаў, калгасаў і вёсак, трэба таксама паказаць і недахопы спаборніцтва, неабходна адзначаць невыкананьне тым ці іншым калектывам узятых ім на сябе абавязкаў.

Гэтым самым мы будзем дапамагаць зьнішчэньню хібаў і памылак.

Самая вялікая небясьпека для справы сацыялістычнага спаборніцтва заключаецца ў тым, **каб яно не абярнулася ў спаборніцтва апаратаў бяз удзелу мас.**

Таму ўся савецкая грамадзкасьць гораду і вёскі павінна штодзенна сачыць за гэтай вялікай справай, не паслабляючы да яе сваёй увагі, уцягваючы ў спаборніцтва ўсё новыя пласты рабочых і сялян і дамагаючыся найбольшых практычных вынікаў.

Я. ПАЛЕСКІ.

ЗЬНІШЧЫМ САЎГАСКІЯ БАЛЯЧКІ

Пытаньні рацыяналізацыі работы, узмацненьня працоўнае дысцыпліны, патаненьня сабекошту прадукцыі да гэтага часу не прыцягнулі да сябе ўвагі рабочых калектываў саўгасаў. Гэта трэба падкрэсьліць з усёй рашучасьцю.

Хто вінаваты ў тым, што памянёныя справы стаяць не на вышыні? Вінаватых шмат, але наша мэта ня шукаць зараз вінаватых, а паставіць рашуча задачу па зьнішчэньні гэтых недахопаў перад супрацоўнікамі і рабочымі саўгасаў.

Каб ня быць галаслоўным у тым, што рацыяналізацыя і патаненьне сабекошту ў саўгасах знаходзіцца на нізкай ступені, падамо некалькі прыкладаў.

Так, напрыклад, у саўгасах Лагаза (Менская акруга), Веснава (Бабруйшчына), Навасёлкі (Гомельшчына), Цярцерына (Аршаншчына) пры сярэднім ураджаі жыта ў 9,9 цэнтн. з гэктара сабекошт ня ўсюды аднолькавы. Так, у Лагозе сабекошт цэнтнэра (цэнтнер—6 пудоў) дасягае 5 р. 78 к., у Веснаве—4 р. 82 к., у Новасёлках—6 р. 77 к. і ў Цярцерыне—12 р. 81 к.

У саўгасах Косіна і Фаніполь (Меншчына) і Лучыцы (Магілеўшчына) сабекошт аднаго цэнтнэра аўсу складае ў Косіне—5 р. 53 к., Фаніполі—10 р. 94 к. і ў Лучыцах—12 р. 72 к.

Сабекошт бульбы складае ў саўгасах Пагост—1 р. 41 к., Вейна—1 р. 78 к. і саўгасе Луцаўшчына—2 р. 14 к.

Аб чым гаворыць паказаныя намі лічбы? Яны гаворыць, бязумоўна, аб тым, што пытаньні працоўнае дысцыпліны, рацыяналізацыі працы ў саўгасах дагэтуль не атрымалі належнай увагі.

Паказаныя лічбы ў галіне ўраджаю в аднаго гэктару ня маюць такіх хіс-таньняў, як лічбы сабекошту аднаго цэнтнэру.

Аб паказаных намі лічбах, на вялікі жаль, калектывы адпаведных гаспадарак ня ведаюць, а кіраўнікі саўгасаў на агульных сходах рабочых саўгасаў толькі скардзяцца на трэст, што ён не дае грошай. Затое вы ня знойдзеце ніводнага саўгасу, каб у яго ў чырвоным кутку была паказана дыяграма сабекошту і скарыстаньня рабочай сілы, гэта ўсё захавана ад вачэй рабочых.

Надта слаба, а па асобных саўгасах зусім не працуюць вытворчыя нарады. Яны займаюцца ня тымі пытаньнямі, якімі належыць.

Справай рацыяналізацыі працы, умацненьнем працоўнае дысцыпліны, вытворчыя нарады амаль зусім не займаюцца, рабочкомы і кіраўнікі саўгасаў таксама амаль нічога ня робяць у гэтай галіне.

Зьдзельшчына, як галоўны стымул узьняцца працоўнае дысцыпліны, у большасьці саўгасаў не праведзена, а дзе праведзена, дык невыстарчальна і не па ўсіх работах, што падлягаюць нармаваньню.

Сярод паасобных саўгаскіх калектываў назіраецца п'янства, хуліганства, кепскія адносіны да машын, жывёлы і г. д.

Праўда, за апошні час пачалася даволі сур'ёзная барацьба з усімі адмоўнымі зьявішчамі. ЦП саюзу с.-г. рабочых і Белсельтрэст далі належныя дырэктывы, але зьверху нічога зрабіць нельга, калі самі месцы ня возьмуцца за справу падзелавому, пасур'ёзнаму.

Да лёзунгу «ўзьняць ураджайнасьць» павінны быць даданы другі лёзунг **—«пата ліць сабекошт прадукцыі за кошт рацыяналізацыі працы і ўзмацненьне працоўнае дысцыпліны», другога шляху для саўгасаў няма.**

Я. ХРЫСАНФАЎ.

Ломка дзедаўскіх звычаяў

ПРАЗ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА—ДА ЎЗДЫМУ КАЛЕКТЫЎНАЕ ГАСПАДАРКІ

Калектыўнае будаўніцтва ў БССР разгортваецца шпаркім тэмпам. У нетрах беларускай вёскі сёньня вядзецца карэнная ломка старых звычаяў, зьнішчаюцца адвечныя падпоры дзедаўскай сельскай гаспадаркі, будуецца новая, культурная гаспадарка з абагуленымі сродкамі вытворчасьці, будуецца калектыўная гаспадарка.

Калектывізацыя набывае масавыя формы, ахапляючы не паасобныя групы перадавых колаў вёскі, а ўсю яе грамадзкасьць: вядзецца вялізарная работа па арганізацыі новых буйных калгасаў, калгасаў-гігантаў, значна ўзбуйняюцца існуючыя калгасы.

У гэтым годзе, як ніколі, камуністычнай партыяй і савецкай уладай пастаўлены вялізарныя задачы перад сельскай гаспадаркай наогул і яе сацыялістычным сэктарам у прыватнасьці. Гэта—задачы пашырэньня пасеўнай плошчы, уздыму ўраджайнасьці, разьвіцьця вытворчых сіл у сельскай гаспадарцы, на падставе вытворчага каапэраваньня і калектывізацыі.

Для канкрэтнага вырашэньня пастаўленых практычных задач па ўзмацненьні і разьвіцьці сельскае гаспадаркі патрэбна разбудзіць творчую ініцыятыву самых шырокіх сялянскіх мас. Яны павінны добраахвотна, з энтузіязмам узяцца за гэтую справу.

Найлепшым мэтадам арганізацыі мас для дасягненьня паказанай мэты ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца спаборніцтва.

У сучасны момант сацыялістычнае спаборніцтва вялізнай хваляй пранясіцца па ўсім Савецкім Саюзе, ахапляючы ўсе галіны народнае гаспадаркі.

Гэтая хваля таксама закранула і калгасы Беларусі...

Нам ужо вядома, што калгасы Гомельшчыны, Бабруйшчыны, Магілеўшчыны ўступілі ў спаборніцтва.

Сацыялістычнае спаборніцтва павінна ахапіць шырокія масы калгасаў і іншых каапэрацыйна-вытворчых аб'яднаньняў Беларусі.

Спаборніцтва не павінна выліцца ў форму парадных пераклічкі паасобных калгасаў і іншых вытворчых аб'яднаньняў, **а ў плянавае выкананьне яскрава пастаўленай мэты.**

Найбольш эфэктыўным будзе спаборніцтва тады, калі перад калгасамі будуць высунуты канкрэтныя задачы.

Спаборніцтва паміж калгасамі на павышэньне ўраджайнасьці і гаварнасьці гаспадаркі, на выкананьне аграмінімуму павінна ставіцца ў парадку іх штодзённай работы.

Адначасова патрэбна паставіць пытаньне аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі сельскае гаспадаркі. На першае месца павінны быць пастаўлены тыя гаспадаркі, якія пры найменшых стратах будуць мець найбольшыя вынікі.

У спаборніцтве паміж калгасамі павінны прымаць удзел аграномы і іншыя спэцыялісты сельскае гаспадаркі ў якасьці кансультантаў пры ажыцьцяўленьні розных агрыкультурных мерапрыемстваў, тым самым садзейнічаючы ўзмацненьню спаборніцтва.

Уступіўшыя ў спаборніцтва, калгасы заключаюць паміж сабой пісьмовы дагавор з дэтальным пералікам тых мэт, якія высоўваюцца спаборніцтвам, а таксама абмяжоўваюць тэрмін выкананьня паасобных задач.

За выкананьнем дагавору павінны сачыць як самі калгасы і раённыя грамадзкія ўстановы, таксама і працаўнікі друку, высьвятляючы ход спаборніцтва на старонках акруговых і цэнтральных газэт.

Пры гэтым важна высьвятляць ня толькі тыя дасягненьні, якія агрымліваюцца ў выніку спаборніцтва, а ўсе тыя недахопы і хібы, якія затрымліваюць гаспадарчае і культурнае разьвіцьцё калектыўнае гаспадаркі.

С. К—ў.



Заворваньне першай баразны ў саўгасе Інтэрнацыянал (Гомель)

Выхаванцы дзіцячай калёніі Сёмкава за працай на палёх саўгасу

Садзяць на полі буракі

Сацыялістычны сэктар—арганізатар спаборніцтва на вёсцы

ПЕРШЫЯ ХВАЛІ СПАБОРНІЦТВА

Ва ўсіх куткох Савецкага Саюзу, дзе на сацыялістычны лад перарабляецца наша сучасьнасьць, моцна ўздымаюцца хвалі творчай гэраічнай ініцыятывы, соцень тысяч рабочых, якія добраахвотна ўзяліся за ліквідаваньне асноўных труднасьцяй нашага часу. Сацыялістычнае спаборніцтва—магутны сродак, лепшая падстава для выкананьня пяцігадовага пляну перабудовы нашай краіны.

Сьледам за фабрыкамі, заводамі і рудзінкамі зьяўляюцца першыя хвалі сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы. Вельмі скупыя весткі гаворыць аб тым, што дзесяткі саўгасаў і калгасаў БССР ужо ўступілі ў спаборніцтва паміж сабой, што мы знаходзімся напярэдадні шырокага разгортваньня спаборніцтва на вёсцы. Саўгасы Іваць, Рачкавічы, Дабрынь, Барысаўшчына, Бабінічы і інш. паклалі першы пачатак!

СЁНЕШНЯЕ СТАНОВІШЧА САЎГАСАЎ НЕ АДПАВЯДАЕ ЗАПАТРАБАВАНЬНЯМ ПАРТЫІ І ЎРАДУ

Савецкія гаспадаркі прайшлі свой аднаўленчы перыяд, паказваючы пэўныя дасягненьні. Толькі за апошнія тры гады асноўны капітал узрос з 7.028 тыс. руб. да 12.040 тысяч руб. Таварная прадукцыя ўзрасла з 3.264 тысяч да 6.365 тыс. руб. Сетка бульбаапрацоўчых і маслабойных заводаў павялічылася з 60 да 93—амаль у тры разы павялічылася пераапрацоўка сырцу. Асобныя саўгасы паказваюць ураджайнасьць да 20 цэнтн. аўсу, 17 жыта і 16 ячменю. Паляпшаюцца ўмовы працы рабочых, узрастае агравытворчая дапамога саўгасаў сялянскаму насельніцтву. Аднак, трэба выразна і цьвёрда сказаць, што сёнешняе становішча і работа саўгасаў не адпавядаюць усім запатрабаваньням, ускладзеным на іх партыяй і ўрадам—у часе рашучай сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе сельскае гаспадаркі.

Дагэтуль у большасьці саўгасаў яшчэ нізкая прадукцыйнасьць і якасьць працы, слабая загружанасьць працоўнага дня, дрэнная выкарыстоўваньне цягавай сілы і складаных машын, нізкая вытворчая кваліфікацыя рабочых. А колькі рознага бруду выкрываюць нам рэвізіі і друк, ад якога (бруду) павінны быць ачышчаны саўгасы.

Рэканструкцыя ўсяе сельскае гаспадаркі патрабуе ад саўгасу новых задач і максымальных тэмпаў у іх ажыцьцяўленьні.

Саўгасы на справе павінны стаць базамі індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі, дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны ва ўздыме ўраджайнасьці, максымальна зьнішчаючы сабекошт прадукцыі. Саўгасы павінны яшчэ больш увмацніць і палепшыць здабытак гатуковага насеньня і племяннога матар'ялу, адначасова стаўшы сапраўднымі фабрыкамі прадукцыі спажываньня (буйныя малочныя фэрмы і агародныя гаспадаркі каля гарадоў).

Саўгасы, як пралетарскія базы, могуць і павінны быць цэнтрамі непасрэднага садзейнічаньня калектывізацыі і каапэраваньню бяднацка-серадняцкага сялянства.

НЕ ПРАХОДЗЯЧАЯ ЧАРГОВАЯ КАМПАНІЯ, А МЭТАД ПРАЦЫ З МАСАМІ

У пяцігодку мы павінны пабудаваць на асушаных балотах на плошчы 50.000 гэктараў новыя буйныя савецкія гаспадаркі. Да канца пяцігодзьдзя валавая прадукцыя саўгасаў павінна вырасьці да 32.133 тысяч руб., таварная—да 21.818 тысяч. Асноўныя капіталы вырастуць да 27.388 тысяч. У будаўніцтва саўгасаў прадугледжваецца ўлажыць 21.347 тысяч руб.

Гэта асноўныя задачы, пастаўленыя перад саўгасамі, партыяй і ўрадам. **Іх выкананьне патрабуе самаахвярнай работы ўсяго рабочага калектыву—ад брыгад падросткаў да кіраўніка саўгасу,—неаслабнага кіраўніцтва партыйных органаў, усебаковага сыстэматычнага кантролю і дапамогі ўсіх савецкіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый, мабілізацыі на службу сацыялістычнаму земляробству ўсіх дасягненьняў с.-г. навукі і тэхнікі.**

Аб'яднаньне вакол грандыёзных пэрспэктыў творчай энэргіі ўсіх рабочых—зьяўляецца цэнтральнай задачай усёй савецкай грамадзкасьці.

Трэба цьвёрда спачатку падкрэсьліць, што спаборніцтва—гэта не чарговая, тэрмінова праходзячая кампанія, што спаборніцтва—гэта мэтад працы з масамі, які дае магчымасьць выкарыстаць здольнасьці і таленты ўсіх рабочых, дае шырокі выхад творчай энэргіі мас.

МЕНШ ПАРАДНАСЬЦІ І ТРАСКАТНІ

Усямерна разгортваючы яго тэмп, трэба **рашуча ўстрымацца ад паказной парадназьці, шуміхі і траскатні. Менш урачыстых пасяджэньняў, нарад, агульных дэкларацый-выклікаў на ўсю Беларусь.**

Асноўныя задачы, якія стаяць перад саўгасамі—гэта ўздым ураджайнасьці, удойнасьці, зьнижэньне сабекошту прадукцыі, уздым прадукцыйнасьці і якасьці працы, працоўнай дысцыпліны, патаненьне і скарачэньне працягласьці будаўніцтва, максымальнае зьнижэньне накладных выдаткаў, мабілізацыя мясцовых рэсурсаў для разьвіцьця вытворчасьці ўсіх галін, выкананьне ўсіх мерапрыемстваў у асеньній с.-г. кампаніі, агравытворчая дапамога калектывізацыі, каапэраваньню і разьвіцьцю ўсіх бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Трэба трымацца за асноўныя зьвенні, якія дапамогуць выцягнуць, увесь ланцуг буйнога ўздыму гаспадаркі.

ПАКАЖАМ ЛЕПШЫЯ ПРЫКЛАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Нядобрасумленным адносінам да цягавай сілы, машын, жывёлы, прагулаў самі рабочыя павінны процістаўіць лепшыя прыклады сацыялістычнай дысцыпліны, арганізуючы ў патрэбных выпадках па ініцыятыве рабочых ударныя брыгады для выкананьня прынятых абавязкаў у часе спаборніцтва. Канкрэтныя абавязкі, што прымаюць на сябе рабочыя калектывы, павінны быць запісаны ў дагавор—гэта лепшая форма рэальнага нагляданьня за выкананьнем іх. Ужо і зараз вызначаецца слабы ўдзел у разгортваньні спаборніцтва ўпоўнаважаных трэсту і кіраўнікоў саўгасаў. Трэба катэгарычна асудзіць настроі асобных таварышоў, якія выказваюцца за апаратнае рэгуляваньне тэмпу спаборніцтва замест яго ўсямернага разьвіваньня.

Побач з агітацыйна-ідэйным узьдзейнічаньнем на працоўныя масы і з рэпрэсіямі ў адносінах да заводамых гультаёў, чужаедаў, дэзарганізатараў магутнай сілай уздыму прадукцыйнасьці працы зьяўляецца спаборніцтва.

У капіталістычным грамадзтве спаборніцтва мела характар канкурэнцыі і прыводзіла да эксплёатацыі чалавека чалавекам. У грамадзтве, дзе сродкі вытворчасьці нацыяналізаваны, спаборніцтва ў працы, не парушаючы салідарнасьці, павінна толькі павысіць агульную суму прадуктаў працы.

(З АДОЗВЫ 16-ай УСЕСАЮЗНАЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ)

Праверку выкананьня дагавароў па спаборніцтве лепш праводзіць у блізка разьмешчаных саўгасах праз непасрэднае азнаямленьне дэлегацый саўгасаў.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ СЭКТАР—АРГАНІЗАТАР СПАБОРНІЦТВА НА ВЁСЦЫ

Конкурс на лепшае праведзеньне веснавой пасеўнай кампаніі ў саўгасах, як частка сацыялістычнага спаборніцтва, павінен атрымаць больш увагі ад кіраўнікоў саўгасаў, прафсаюзных арганізацый на месцах, усёй грамадзкасьці. Сацыялістычнае спаборніцтва ў яго канкрэтных абавязках павінна прадугледжваць навукова-ўгрунтаваныя мажлівасьці выкананьня тых ці іншых мерапрыемстваў, шляхоў іх выкананьня. Гэта патрабуе дапамогі сацыялістычнаму спаборніцтву з боку шырокіх колаў спэцыялістых сельскай гаспадаркі, дасьледчых устаноў.

Сацыялістычны сэктар павінен стаць прыкладам умелага сацыялістычнага спаборніцтва, павінен быць арганізатарам і кіраўніком гэтага руху на вёсцы.

Аднак, эразумела, што сацыялістычная рэканструкцыя з усімі яе сацыяльнымі і вытворча-тэхнічнымі дэталямі з посьпехам пройдзе тады, калі з максымальнай паўнатой будуць выкарыстаны мясцовыя сродкі, творчая энэргія тысяч батракоў-калгаснікаў, калі будзе разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва цэлых вёсак, сельсаветаў, раёнаў.

Усе, як адзін, на сацыялістычнае спаборніцтва.

Т. АЎЧЫНЬНІКАЎ.

КАНЕЦ „УЛАСНАЙ САРОЧЦЫ“

Калі глядзіш на тое, што робіцца цяпер у вёсцы Чапялі, Старобінскага раёну, Бабруйскае акругі, дык мімаволі ў галаве узьнікаюць слаўныя словы Дзям'яна Беднага: «Хоть дырява рубашка моя, за то собственная—своя!».

Гэта фраза можа сапраўды характарызаваць думкі вякамі складзеныя нашым сялянствам.

Уласная хатка!... **Свая** кароўка і конік... **свая** сарочка, **свае** куры. Вось што, галоўным чынам, шкодзіць цяпер справе калектывізацыі вёскі.

І нічога тое, што хатка дзіравая і праз страху цячэ вада, нічога, што коніка і кароўку трэба вясною за хвост цягаць, нічога, што куры круглы год не нясуцца...

І ўсё-ж такі гэта векавечная думка парываецца. Супроць прымітыўных дзедаўскіх мэтадаў выступаюць перадавыя вёскі начале з беднатою і серадняками.

Вёска Чапялі. Звычайная вялікая, бядняцкая вёска.... Паабапал доўгімі істужкамі ідуць сялянскія шнуры-палоскі, на якіх то там, то сям паказваюцца аратыя, выехаўшыя ў поле.

На вуліцы страшэнная грязь... Прыяжджаючыя прадстаўнікі з гораду губляюць галёшы ў ліпкім глеі і клянуць пагоду і глебу....

Як і ў іншых вёсках, тут ёсьць «капіраты», «пажарнае дэпо добраахвотнай чапялёўскай пажарнай дружыны» з пабітым ліхтаром....

Есьць малацаватыя хлапцы і са рамлівыя ружовыя дзяўчаткі.

Усё роднае, знаёмае, дарагое....

Але гэта між іншым, справа зусім ня ў тым. Робіцца ў Чапялёх нешта важнейшае, кіпіць і бурліць вёска новаю нячуванаю барацьбою....

Гэта—арганізацыя ў Чапялёх буйнога калгасу-гіганта на надзельнай сялянскай зямлі. Але зьвернемся крыху назад да недалёкага мінулага Чапялёў.

* * *

«Зьвязда» ўжо знаёма з Чапялямі, як з вёскаю. Знаёма таксама і з Чапялёўскаю партыйнаю ячэйкаю; досыць напомніць, што Чапялёўская ячэйка КП(б)Б на аглядзе вясковых ячэек атрымала прэмію. Па чапялёўскім мэтадзе павінны вучыцца працаваць іншыя вясковыя ячэйкі і іншыя вёскі.

Уся справа тут у тым, што людзі тут працуюць не на словах, а на справе і таму мы сёньня гаворым аб выніках.

Яшчэ ў 1925 годзе ячэйка паставіла пытаньне аб арганізацыі ў в. Чапялёх калектыўнай гаспадаркі. Даручылі справу двум партыйцам сялянам-бедняком уступіць у калгас і пачаць вярбоўку новых членаў. З гэтага і пачалося. Вёска апчацінілася супроць нячуванай новай справы.

— Як?! Аддаць усё ў адну кучу?

— Што-ж гэта будзе?—крычалі сяляне.

Кулакі не адставалі і не ўпускалі моманту, каб выступаць супроць арганізацыі калгасу. «Ня слухайце гэтых бальшавікоў, дурныя! Дзе-ж вы бачылі, каб можна было ўжыцца 20 сем'ям! Тут у аднэй сям'і і то сваркі кожны дзень, а то пачняце есьці з аднаго катла!

Не пайшло пасельніцтва ў калгас. Партыйцы сабраліся зноў і абгаварылі пытаньне з усіх бакоў. Потым склікалі сход грамадзян, які пастанавіў: алпусьціць пад калгас былы маёнтак Чапялі і сад.

Пачатак зроблены, і калгасьнікі, лік якіх ужо дайшоў да пяці, узяліся за калектыўную працу.

Напружана гледзячы за кожным крокам калгасу, бедната чакала выгаду з свайго становішча. Сьціснуўшы зубы, чакалі «былыя людзі» развалу калгасу.

А калгасьнікі не драмалі. На другі-ж год увосень 1927 году з дапамогаю агранамічных сіл зьбіралі падвойны ўраджай. На атрыманы прыбытак закупілі машыны: сявярку, жнявярку, малатарню... Часткова за гатовыя грошы, часткова—у крэдыт.

І разам заварушылася вёска. У калгас пасыпаліся заяўкі:

— «Прымайце, уцяміў карысьць калгасу» і г. д.

Бязумоўна, што маленькая плошча былога маёнтку не магла зьмясьціць усіх жадаючых уступіць у калгас.

І таму партыйная ячэйка зараз-жа паставіла пытаньне аб арганізацыі ў в. Чапялёх буйнога калгасу на надзельнай сялянскай зямлі...

* * *

На першым сходзе па арганізацыі калгасу была ўся вёска...

Прадстаўнікі райкому партыі і РВК гаварылі мала. Бо практычны сялянскі розум любіць ня словы, а справу, а справу паказалі дзядзьком чапялёўскія камунары.

На першым-жа сходзе запісалася ў калгас «Прамень камуны» (былая в. Чапялі—двароў 200, 70 сем'яў, многія парашылі параіцца яшчэ з жонкаю і ўступіць заўтра. Нейкім сьвятам веяла ў гэтыя дні ў Чапялёх. Толькі і гаворкі, што аб калгасе.

— Дзядзька Пархом! Дык ты кажаш ужо ўступіў у камуну? Га? Я, братка, таксама ўступіў.

* * *

Цяпер калгас налічвае ў сябе больш за 150 членаў. Калгасьнікі ўжо вышлі на поле, ад калгасазюзу атрыманы трактар, хутка прыбудзе і другі.

Будучыня «Праменю Камуны» вялікая. У калгасе мяркуецца пабудова цагельнага і сыраварнага заводаў, якія пададуць яму прамысловую падставу.

У гэтым-жа годзе калгас пачынае будаваць вялізарны дом для жыцьля і культурных устаноў.

Калектыўная праца паказала цуды, пакажа іх яшчэ больш год за годам.

Гледзячы на падзеі ў былой вёсцы Чапялёх, так і хочацца прывесьці ў гэты калгас нявернікаў у лінію партыі, зьняць з іх акуляры і сказаць:

— Вось у гэтых гэрояў партыйцаў і беднаты вучэцеся працаваць!

У Чапялёх лінія партыі відна ўсюды.

ЮРКА БЯЛЬКО.

Калгас «Прамень Камуны».

СПАБОРНІЦТВА НА ВЕСНАВЫХ ПАЛЁХ

Калгасы, саўгасы і працоўнае сялянства выступілі ў паход за ўраджай

САЎГАСЫ БАБРУЙШЧЫНЫ ПАКАЗВАЮЦЬ ПРЫКЛАД

БАБРУЙСК (наш кар.). Уступаючы ў сацыялістычнае спаборніцтва, саўгасы і асобныя вёскі Бабруйшчыны ставяць перад сабой мэту падняць ураджайнасьць і пашырыць пасеўную плошчу. Першым на сацыялістычнае спаборніцтва выступіў саўгас Івань, Слуцкага раёну. Рабочыя саўгасу пастанавілі: ва што-б там ні стала выканаць на ўсе 100 проц. пасеўны плян, павысіць ураджай аўсу на 35 проц., бульбы на 15 і г. д.

Поруч з гэтым яны пастанавілі пашырыць пасеўны клін на 42 гэкт. і ўзараць 12 гэкт. сухадолу. Рабочыя саўгасу Івань выклікалі на спаборніцтва саўгас Рачкавічы і сур'ёзна ўзяліся за выкананьне пастаўленай перад сабою задачы.

Рачкаўцы прынялі выклік іванцаў і ўзяліся, як сьлед, за працу па павялічэньні прадукцыйнасьці гаспадаркі і ўзьняцьці ўраджайнасьці. Такім чынам, паміж савецкімі гаспадаркамі Бабруйшчыны зараз шырока разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва. Большасьць савецкіх гаспадарак акругі, якія ўжо выступілі ў паход за падняцьце ўраджайнасьці, пашырэньня пасеўнай плошчы, выпрацавалі канкрэтныя і практычныя мерапрыемствы і ўжо праводзяць іх у жыцьцё. Так саўгас Завалочыцы ўжо адрамантаваў увесь с.-г. інвэнтар і трактары, правёў с.-г. курсы на 40 чалавек, абвясьціў конкурс на лепшага рабочага на палявых работах.

Земляробчая арцель «Амур» (Глускі раён) пачала працу па пашырэньні пасеўнай плошчы на 10 гэкт. У выніку раду аграмерапрыемстваў, яны маюць на мэце павялічыць ураджай аўсу з гэктара да 70 пуд. і бульбы—800 пуд. Для членаў арцелі адчыняюцца дзіцячыя яслі. Сельска-гаспадарчая арцель «Свабода», Рагачоўскага раёну, ужо правяла наступныя мерапрыемствы: насеньне адсартавана, сельска-гаспадарчы інвэнтар наладжаны і падрыхтаваны да работы.

Арцель атрымала 100 рублёў крэдыту на пабудову кавальска-сьлясарнай майстэрні. Гэтаю майстэрняю арцель будзе абслугоўваць сялянства суседніх вёсак. Да 20 мая майстэрня пачне працаваць. Інструмант для яе ўжо закуплен. У бягучым годзе арцель паставіла сваёю задачаю правесьці павялічэньне пасеўнай плошчы на 4 гэктары. Сад арцельны прывезены ў поўны парадак. Праведзена абскрабальне кары, пабелка саду і апырсканьне. Сёлета арцель павялічвае засеў бульбы і коранплодаў. Правядзеньнем гэтых мерапрыемстваў арцель спадзяецца дабіцца ўраджаю аўсу і ячменю ў 75 пуд. з дзесяціны і бульбы ў 900 пудоў.

З свайго боку арцель выклікала на актыўную барацьбу за лепшы ўраджай арцелі «Пралетары», «Пчолка», «Усход», «Най Лебэн» і «Вэкер» Бабруйскага раёну.

Сьледам за саўгасамі і калгасамі вышла на спаборніцтва і вёска.

Вось жыхары пас. Новая Плоская (Клічаўскі раён) пры дапамозе агранома ўзялі рашучы курс, каб атрымаць высокі ўраджай, ачысьцілі насеньне, пратруваюць яго ад галаўні. З вясны Нова-Плескаўцы пастанавілі ўвесьці 8-мінаўлёвы севазварот. Сяляне вёскі Шышава (Асіпавіцкі раён) дружна пайшлі ў наступленьне супроць галаўні. Усёю вёскаю ачысьцілі насеньне, праканалі канавы для сьцёку вады з поля, кожны грамадзянін закантрактаваў частку свайго пасеву. Цяпер узяліся за пасеў канюшыны і лубіну на папары.

Ч.

САЎГАСЫ МАЗЫРШЧЫНЫ НЕ АДСТАЮЦЬ

МАЗЫР (наш кар.). Савецкая гаспадарка Слабады (Калінкавіцкі раён) выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва савецкія гаспадаркі Дарашовічы і Канстантынава.

Рабочыя і служачыя гаспадаркі Слабады на сваім агульным сходзе прынялі на сябе абавязак пэўнасьцю скончыць веснавую пасеўкампанію да 30 мая, выканаць на ўсе 100 проц. гадовы вытворчы плян, якім прадугледжваецца: павялічэньне нормы выпрацоўкі на 15 прац. у параўнаньні з мінулым годам, падняцьце ўраджайнасьці па аўсе на 40 прац., жыце—на 30 проц. і па бульбе—на 33 прац., павялічэньне ўдою малака—на 12 прац., пашырэньне пасеўнага кліну на 25 прац. Саўгас узяў на сябе абавязак падняць вытворчую дысцыпліну, аказаць усямерную дапамогу бяднейшаму сялянству. Калектыў саўгасу парашыў узяць шэфства над 4 сялянскімі гаспадаркамі, адрамантаваць 15 сялянскіх плугоў, 15 барон, 3 вазы і адпусьціць на часовае карыстаньне рад сельгаспадарчых машын бяднейшаму сялянству.

Савецкая гаспадарка Дабрынь (Каралінскі раён) выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва сав. гаспадаркі Ліпава, Камаровічы і Лучыцы. Рабочыя саўгасу ўзялі на сябе абавязак павялічыць на 10 прац. норму выпрацоўкі, падняць ураджайнасьць на 20 прац., пашырыць пасеўны клін на 12 проц., аказаць аградапамогу сялянству, узяўшы шэфства над 5 бяднацкімі гаспадаркамі.

Б. Ш.

Масавую агітацыю па-новаму

Сацыялістычнае перабудаваньне ўсяе народнае гаспадаркі немагчыма бяз самага актыўнага ўдзелу мільёнаў рабочых. У зьвязку з гэтым якасьць нашай агітацыі на прадпрыемствах павінна быць рашуча палепшана. Фармальны падыход да правядзеньня сходаў бяз уліку таго, у якой меры тэма дакладу дайшла да слухачоў, у якой меры пытаньне, пастаўленае ў дакладзе, растлумачана ўдзельнікам сходу—на справе азначае падмену пытаньня аб сутнасьці агітацыі і яе мэтах бюракратычным імкненьнем да паказнога дабрабыту.

Такі паказны дабрабыт частка выяўляецца ў справаздачах партыйных і прафсаюзных заводзкіх арганізацый. За справаздачны пэрыяд праведзена столькі і столькі сходаў. У сходах удзельнічала столькі чалавек, у спрачках столькі—такая звычайна мова дакладаў, вусных і пісьмовых аб пастаноўцы масавай агітацыі на прадпрыемствах. Між тым, ні колькасьць сходаў, ні нават колькасьць удзельнікаў у спрачках не зьяўляецца сама па сабе выстарчальным паказальнікам якасьці агітацыі. З чым пашоў рабочы пасьля сходу, які ўплыў меў сход на яго адносіны да вытворчасьці, ці ахапіў сход усю масу рабочых, у тым ліку і новыя кадры, зьвязаныя з вёскай, ці закрануты былі на сходах тэмы, якія найбольш хвалююць рабочую масу—вось тыя пытаньні, па якіх можна меркаваць, у якой меры мэтазгодная зьяўляецца пастаноўка агітацыйнай работы. Між тым, іменна гэтымі пытаньнямі менш за ўсё займаюцца нізавыя арганізацыі.

Вось чаму надрукаваная ў «Правде» ад 12-га мая пастанова Цэнтральнага Камітэту партыі аб паляпшэньні пастаноўкі агітацыі сярод рабочых заслугоўвае самае сур'ёзнае ўвагі. У гэтым цыркуляры паказваецца на неабходнасьць такой пастаноўкі палітычнай агітацыі, якая будзе дапамагаць мабілізацыі самых шырокіх мас рабочае клясы для актыўнага і сьвядомага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Гэта агітацыя павінна разьвіваць рэвалюцыйную пільнасьць пралетарыяту і на жывых, надзенных фактах з жыцьця данага прадпрыемства выхоўваць клясавую сьвядомасьць рабочых.

У зьвязку з гэтымі задачамі агітацыя павінна быць набліжана да цэху, яна павінна абхапляць усю масу рабочых, у тым ліку новыя кадры рабочых, яна павінна абслугоўваць—на прадпрыемствах, што працуюць у дзьве ці тры зьмены—рабочых усіх зьмен.

Тэзісы паказаньні ЦК патрабуюць па сутнасьці карэннага перабудаваньня ўсёй масавай работы і партыйных, і прафсаюзных арганізацый. У нас вельмі мала клюбных памяшканьняў, якія могуць зьмясьціць усіх рабочых прадпрыемства, якія абслугоўваюцца паасобным клюбам. Пры такіх умовах толькі сходы па цэхах ці па асобных групах могуць праходзіць так, што рабочы ў іх досыць актыўна ў

Бруно Ясенскі

„Я жгу Париж“

ЧАСТКА ДРУГАЯ

.....Дні праз два П'ана прынялі на працу. На ангельскім тэкстыльным заводзе—чорнарабочым. з восьмай да восьмай. Плата—два мейсы (прыблізна 14½ кап.) у дзень. Гэтага і на адзін рыс ня хопіць. Знайшлі нагоўку. Далей ужо—прабівайся сам. На работу ішоў бадзёра, з ахвотаю. Там блізка сустрэнецца з рабочай масай, з сапраўдным працоўным жыцьцём.

А восьмай вышаў з заводу зьбянтэжаны і панураны. У горле перасядаў камякамі страшны крык. Не, гэтага ён і не ўяўляў. Што кніжкі, голад, галеча, абстрактныя табліцы статыстыкі. Тут упярэшню распыранымі ад сполаху вачыма зьмерыў ён усю бездань чалавечага гора, зьнявагу, усю бясконцасьць чалавечых пакут.

На заводзе была страшэнная гарачыня, людзі працавалі амаль што голыя, аблёваючыся потам. Між машынамі праходжваліся на залі белыя майстры з бізунамі ў руках. і бізун раз-по-раз, як зьмей са сьвістам, узьвіваўся над згорбленай сьпінай стомленага рабочага і апускаўся ўніз з жасьлівым выцьцём. На згорбленых сьпінах, нібы адзнакі адпрацаваных гадзін, расьлі чырвоныя паскі, і пот у гэтых мясцох выступаў ня белы, а ружовы. Большую палову рабочых складалі жанчыны і дзеці, часта не старэйшыя дзесяці год, і па іх зьнясіленых ад напружанасьці тварыках ліў пот, буйны, як сьлёзы, як незразумелыя страшныя кроплі, якія часта капаюць са зьдзіўленых вачэй зьбітае да паўсьмерці жывёлы.

Вялізныя машыны, падобныя да страшотных двугаловых драконаў, глыталі паэрыя, як дым, клубкі паклі, каб праз пяліну выплюнуць іх цягучай сьлінай доўгіх валокнаў, якія мігам наматваліся на шпулькі, што круціліся раўчкамі. Потым жалезныя пальцы ў соты раз хапалі, разматвалі гэтыя валокны, расьцягвалі бясконца ў тонкія ніткі, і ніткі, нацягнуўшыся да адказу, разрываліся ў паветры, каб іх тут-жа мігам схапілі і зьвязалі ў вузельчык жывыя пальцы работніц. Тады з буркатлівага джэрала машыны ў вялізныя кашы пасыплюцца пыркамі шпулькі; і нагружаныя кашы працягнуць кудысьці ў туман, надрываючыся ад непасільнае працы, кволыя хлапчукі.

Пад вечар, калі рухі стомленых, дурэючых ад зьнямогі людзей станавіліся марудными адрывістымі і няроўнымі, як няроўныя ўзмахі нязмазанага кола, рысы незразумелага чырвонага алоўка клаліся на плячох адна ля аднэй, нібы раззіваны містычны цэнзар узяўся выкрэсьліць адзін за адным з кнігі сьветабудовы нікчэмныя радкі чалавечых істот.

У паветры цяжкім туманом насіўся пух, і ў ім, як ў хмарах едкага дыму, аголеныя фігуры людзей сударажна гнуліся ў прыступах страшэннага кашлю, нібы ў сьмяротных сударагах целы грэшнікаў у пекле на малюнках з катэхізісу.

Так сярэднявяковыя мастакі іменна такім малявалі пекла: толькі ў іх пекле, здаецца ня было дзяцей, а можа здагадлівы хрысьціянскі бог, якому апрыдрыла катаваць дарослых, стварыў з таго часу новае, спэцыяльна дзіцячае пекла, а манахі ўталілі гэта ад веруючых?

П'ан ішоў у сваю кануру, нібы накурыўшыся опіуму, з хаосам у галаве і волавам налітымі нагамі.

Уначы сьніліся яму спаласаваныя сьпіны, выкрыўленыя ад пакуты вусны, павялічаныя ад жаху і нечалавечае нэндзы вочы, сярод лятаючых клубкоў дыму. Потым скрозь дым пачалі прабівацца чырвоныя языкі. Усё ахапіла яскравае полымя і сярод языкоў агню—белы, рабы майстар з сушыльні з двума бізунамі ў руках танцаваў танец зьмей. Нарэшце, усё гэта растварылася ў патоках нейкай бязглуздзіцы, якую выкідвала на распалены, як галавешка, мозг мерная вадакачка сну.

Праз месяц П'ан абжыўся і прызвычаіўся. Ад пабояў, кашлю і выцьця, ад едкага пуху-туману галава больш ня кружылася. Вочы глядзелі ўпэўнена і сурова. Ён самааддана ўзяўся за работу: арганізоўваць гурткі. Было надзвычайна цяжка. Удзень нельга перакінуцца слова з кім-бы там ні было. Кожны крок вымеран, вылічан. Ды і рабочыя, падаючы пасьля работы ў зьнямозе, слухалі бязуважна.

Прабаваў праводзіць гутаркі ў сьвяточныя дні. Стараж[illegible]ыя рабочыя паглядалі на гэту справу скрыва. На фабрыцы баяліся і ўздыхнуць мацней. За самае нязначнае слова—ня кажучы ўжо пра якое-небудзь супраціўленьне—выганялі вон. Як-жа тут супраціўляцца? Адыходзілі ў бок і небясьпечліва паглядалі: не наклікаць-бы бяды якое.

Усё-ж, у канцы другога месяца ўдалося з'арганізаваць невялічкі гурток з моладзі. Працаваць было амаль што нельга. Сярод моладзі—большасьць няпісьменных. Наладзілі вячэрнія курсы элемэнтарнага навучаньня. Прыходзілі ня ўсе. Пасьля дванаццаці гадзін цяжкое працы вочы ня слухаліся і не хацелі глядзець. Цяжкія літары ня ўсприймаліся мозгам, затуманеным дымам зьнямогі. Як-жа такіх навучаць? Апускаліся рукі.

Сярод моладзі нечакана знайшоў актыўнага памочніка. Шаснаццацігадовая шпульніца—Чэн. Аказалася на дзіва інтэлігэнтнай дзяўчынай. Вучылася шчыра—выперадзіла ўсіх. Актыўна агітавала сярод таварышак. Зацягнула ў гурток каля двух дзесяткаў работніц.

Вельмі спадабалася П'ану. Падрабязна распытвала пра ўсё, старалася ўсё запомніць. Пытаньні ставіла заўсёды да рэчы, не па дзіцячаму, адбуманыя і дакладныя. Касыя, разумныя вочы глядзелі коратка і адкрыта.

Аднойчы, неяк па дарозе з фабрыкі Чэн расказала П'ану сваю нядоўтую гісторыю. Яна—вясковая дзяўчына. У бацькі трынаццацера дзяцей, а зямлі ўсяго два му (прыблізна ¼ гэктара). Дома цяжка. У трынаццаць год бацька прадаў яе старому нейкаму расьпусьніку. Уцякла. Пехатою прабралася ў горад. Працавала на японскай фабрыцы. Плацілі мала, нельга было пракарміцца. Цяпер працуе тут шпульніцаю. Цяжка, але ўсё-ж лепей.

П'ан жанчын не сустракаў. У айцоў-лазарыстых не даводзілася. Але бесьсьвядома неяк навучыўся адносіцца да іх з пагардаю: нявольніцы, самкі—і толькі. Гаварылі тут вякі варожасьці, спадчына пакаленьняў. Ганебнае слова: жанчына.

У ёй-жа зьдзіўляла дзіцячая чыстата, строгасьць, не падзявоцку, сур'ёзны поляд на жыцьцё, прагнасьць ведаў, сьвядомая, нябачная ў такім кволым целе воля да барацьбы.

Вечарамі доўга гутарылі, забываючыся пра ежу і спатканьне.

З яўкі зварачаліся ў сваю каморку і выцягваліся на мяху, напханым саломаю. П'ан успамінаў чыстыя простыя вочы і словы, яе зацікаўленасьць і ў думках казаў: «мілая!» Ён сам сябе злавіў на гэтым. Што-ж гэта такое? Кахае? Якое сьмешнае слова! І што гэта такое каханьне? Палавая сувязь і дзеці? Не, гэта ня тое. Паіншому. Проста—добры, мілы таварыш. Але адчуваў: не, зноў ня тое. І, стараючыся ня думаць, засынаў.

Аднойчы вечарам скончыўшы работу (быў якраз вольны вечар) П'ан затрымаўся ля выхаду. Вось ужо выйшлі апошнія. Ён, напэўна, праглядзеў. Чэн, мусіць занята. Працавала цяпер сама з некалькімі работніцамі. Пашоў дадому—папрацуе адзін. Скарыстоўваў вольны час і ўначы.

А на фабрыцы выходзіўшай Чэн у вузкім праходзе загарадзіў дарогу рабы шырокаплечы майстар. Чапляўся і прасьледваў даўно. Цяпер не пасьпела крыкнуць—заткнуў рот шырокай, аброслай валасамі, рукой. Пацягнуў бедную дзяўчыну ў каморку. З роспачы яна ўкусіла яго за нос. Ударам кулака паміж вачэй аглушыў яе, як каня. Паваліў на падлогу і згвалціў яе, няпрытомную.

Вышаў абціраючы хусткаю ўкутаны нос.

Праз некалькі дзён Чэн сустрэлася з П'анам на пасяджэньні гурткa. Зьдзівіўся перамене. Маленькая—стала яшчэ меншай, мізарнейшай, нібы выцягнулі з яе нейкую, падтрымліваючую яе, спружынку. Вочы вялікія і зьдзіўленыя, як у пакрыўджанага дзіцяці, якія раней глядзелі наіўна і проста, зараз палахліва хаваліся. П'ан падышоў пасьля пасяджэньня, запытаўся, ці ня хворая яна. Чэн вінавата ўсьміхнулася. Вышла: ні то ўсьмешка, ні то—вось-вось заграе заплача. Сказала: галава баліць.

П'ан занепакоіўся. Надта стамілася. Ясна. Дзе-ж такому дзіцяці працаваць, як катаржніку!

З таго часу сустракаліся рэдка. Хіба што ў гуртку. Займаліся, як і раней, шчыра. Але відаць было—нешта надламалася. Прабаваў пагаварыць. Яна саромліва аднеквалася. стамілася. І сьпяшаецца. Зараз яна вядзе свой маленькі гурток работніц. Нельга спазьняцца—усе намарыліся. Так нічога і не дабіўся.

А тут раптам—адна вялікая нечаканая радасьць. Прынесьлі газэты. У Расіі—рабочая рэвалюцыя. Уся ўлада ў руках саветаў. Кіруюць камуністыя. Абы толькі ўтрымаліся! Рабочая, сацыялістычная дзяржава па суседзтве—які магутны саюзьнік! Думаючы пра гэта, лягчэй было працаваць, зносіць няўдачы, зьдзекі, пакуты, нечалавечы ўціск.

Беглі месяцы.

На заводзе прада шпарка пасоўвалася. Былі ўжо тры гурткі з старэйшых рабочых. Прасіць дапамогі не хацеў: людзей мала. Усё—сам. Ледзь-ледзь пасьпяваў. Уласныя заняткі на час прыпалося закінуць. Але ўсё-ж начамі, калі заставаўся адзін, сумаваў па ранейшых гутарках з Чэн, па вялікіх, даверлівых вачох, па цішім, захапляючым голасе.

Поўнага вечару—мінула ўжо некалькі месяцаў—выходзячы, П'ан убачыў на дварэ зборышча рабочых. Падыйшоў, запытаўся, у чым справа.

— Шпульніца ў студні ўтапілася.

Здрыгнуўся, распіхваючы цікаўных, прабраўся бліжэй. Сэрца шалёна калацілася. Пазнаў здалёк. Ляжыць маленькая, кволая, тварык пасінеў, распух, і ў напалову заплюшчаных вочках—дзіцячы сполах.

Да позьняй ночы, усхвалёваны, блытаўся па вуліцах, ня маючы сілы разгадаць жудасную загадку. Што-ж здарылася? Як гэта ён мог не заўважыць, не паклапаціцца, ня стрымаць?

Позна вярнуўся абураны ў сваю каморку. На стале—ліст. Дрыжачымі рукамі пачаў чытаць.

«Мілы! Не асудзі! Рабы чорт перамог, заразіў дурною хваробаю. Як-жа жыць? Скажы табе—ты-б, мусіць, забіў яго. А так—ён будзе пакараны. Я паведамі[illegible]ла ўладзе, што ён—вінаваты. Як страшна паміраць, не дачакаўшыся нашай перамогі. Напэўна, ўжо хутка! Будзе лепш. Мілы мой, дарагі. Кахаю».

П'ан затрэсься ад злосьці. Рынуўся, як ашалелы. На парозе спыніўся. Куды? Забіць рабога? Усё роўна прыдзецца пачакаць да раніцы. Не распранаючыся, прыкархнуў на мяху. Думкі праносіліся чарадою. А ўнутры—выразны, фізычны боль.

Паступова з хаосу вынырнулі думкі правільныя, разьлічаныя. Што-ж рабыць? Пешка. Колка вялізнага мэханізму. Забіць адзінку! Глупства! Калі дрэва закрывае сонца, хіба паможа, калі сарвеш жолуд? Трэба сьсячы дрэва. Падкапаць карані. Рухне—усе жалуды асыплюцца. Толькі цьвёрда прадумаць, ня спыняць пачатага. Не стамляцца. Стаць самому сякерацю. Натаўшы нянавісьць, як лёза, каб не прытупілася.

Назойліва вярнулася думка пра Чэн. Маленькая! Такая разумніца! Усё хацела ведаць, а ня ведала такой простай рэчы, што толькі кітайцы караюць віноўнікаў у самазабойстве. Кітайскі закон для белых ня пісан. Белым на яго наплываць. І каму-ж у галаву прыдзе пакараць забойцу кітайскай дзяўчынкі?

Да раніцы праседзеў. Раніцою прышоў на работу просты, сур'ёзны будаёны. Але ўнутры нешта надарвалася. Вечарам у гуртку растлумачыў талкова, выразна адказваў на пытаньні і адчуваючы дзесяць пар касых вачэй, накіраваных на яго, цьвёрда ставіў кропку:

— Сьмерць прыгнятальнікам!

(Працяг).

Надвор'е спрыяе добраму ўраджаю ў БССР

СТАН ПАСЕВАЎ У БЕЛАРУСІ

(Гутарка з кіраўніком ЦСУ тав. Прафэрансавым)

Кіраўнік ЦСУ і старшыня экспэртнага савету па вызначэньні хлебафуражнага балянсу тав. **Прафэрансаў** у гутарцы з нашым супрацаўніком паведаміў наступнае аб відах на ўраджай:

— Экспэртным саветам прыняты віды на ўраджай у Беларусі на 15 мая па азімых хлябох.

Гэтыя віды характарызуюцца падвышэньнем у параўнаньні з мінулым годам на 0,3 балу і складаюць па пасевах жыта—3 балы.

Для таго, каб вызначыць стан пасеваў азімых хлябоў, трэба зьвярнуць увагу на зімовы пэрыяд—з моманту ўходу хлябоў пад сьнег да моманту іх выхаду.

Уход пад сьнег характарызаваўся балам 3,1. Зіма сёлета была па сваёй нізкай тэмпэратуры рэкордная, халады даходзілі да 40 гр. па Цэльсію і за ўвесь пэрыяд зімы ня было зусім адлегі.

Аднак, гэтыя акалічнасьці не адбіліся няспрыяюча на хлябох, бо сьнежны насьціл быў зусім роўнамерны па ўсёй тэрыторыі Беларусі і досыць высокі. З прычыны гэтага прамярзаньне глебы было невыстарчальнае. Толькі ў паасобных выпадках, дзе сьнег не затрымліваўся, глеба прамерзала глыбока—да 70 см. У сувязі з гэтым дрэвы позна распусьціліся.

Выхад хлябоў з-пад сьнегу характарызуецца балам 2,7—вышэй на 0,2 у параўнаньні з мінулым годам.

Зьнішчэньне пасеваў у гэтым годзе самае нязначнае—2 проц. да агульнай плошчы пасеваў у Беларусі. Але трэба адзначыць, што часта статагэнтура па суб'ектыўных прычынах псаваньне пасеваў заносіць у рубрыку зьнішчаных.

Такім чынам, процант зьнішчэньня пасеваў будзе яшчэ меншы.

Спрыяючым апэнкам відаў на ўраджай дапамагалі тыя абставіны, што сьнег паў на мерзлую зямлю і толькі па 16% пасеўнай плошчы сьнег выпаў на яшчэ не прамёрзшую зямлю. Вільгаці ў зямлі да ўходу пасеваў пад сьнег было выстарчальна ў 60 проц. пасеваў, ў 37 проц. быў лішак і нявыстарчальнасьць влагі была ў 3 проц. пасеваў.

Трэба сказаць, што зіма ў гэтым годзе зацягнулася, з прычыны чаго сяўба ў Беларусі пачалася некалькі пазьней, чым летась. Калі ў мінулым годзе пачалася сяўба ў 20-х чыслах красавіка, то сёлета пачалі сеяць каля 10 мая.

Апошнія мэтэоролёгічныя паказаньні стану надвор'я на даны пэрыяд таксама трэба лічыць спрыяючымі. Так, апошнія дажджы далі досыць вільгаці і будуць спрыяць добраму росту як азімины, так і ярыны.

Дажджы і пасевы

Інспэктар па паляводзтве Наркамзему БССР т. ЗАЙЦАЎ паведаміў наступнае:

— Пасьля 2-тыднёвага цёплага надвор'я вялікі дождж у апошнія дні ўвогуле школы пасевам ня мог зрабіць. Наадварот, па лёгкіх і пяшчаных глебах дажджы спрылі лепшаму росту як жыта, так і ярыны. Дождж за апошнія дні станоўча будзе ўплываць на ўсходы яравых пасеваў.

Цёплае надвор'е, якое стаіць у Беларусі, адначасова з дажджамі яшчэ больш спрыяе росту хлябоў. Ня выключана, зразумела, магчымасьць. вымачак пасеваў у асобных мясцох вялікім дажджом.

***

У Менску атрымана паведамленьне аб тым, што выпаўшы ў суботу, 18-га мая, вялікі дождж у Пухавіцкім раёне, вымыў насеньне яравых і гародніны на плошчы ў 300 дзесяцін. Страты высьвятляюцца.

Адкрываецца рад новых навучальных устаноў

На апошнім пасяджэньні калегіі Наркамасьветы вынесена пастанова аб адкрыцьці ў Беларусі ў 1929-30 навучальным годзе раду новых інстытутаў, навучальных устаноў. тэхнікумаў і школ.

Адкрываецца навукова-дасьледчы інстытут па пэдалёгіі і пэдагогіцы ў Менску.

Пры БДУ адкрываецца пэдалёга-пэдагагічнае аддзяленьне. каапэрацыйнае аддзяленьне і хэмічны факультэт, тарфянае аддзяленьне і аддзяленьня буйнай сацыялістычнай гаспадаркі—пры Беларускай с.-г. акадэміі, Цэнтральныя дзённыя курсы раённага партактыву ў Менску, яўрэйскае аддзяленьне пры Віцебскім рабфаку, новыя рабфакі ў Гомелі і Воршы.

Адкрываюцца—пэдтэхнікум у Рэчыцы, дашкольны тэхнікум у Менску, 2-х гадовыя беларускія пэдагагічныя курсы ў Воршы, Барысаве, Полацку, Мазыры, аднагадовыя пэдкурсы—у Гомельшчыне пры двух 9-ці годках на 200 чалавек; у Менску, Віцебску і Магілеве—па 100 чалавек.

Будуць адкрыты—новае аддзяленьне па апрацоўцы садавіны і гараднины пры Мар'іна-горскім с.-г. тэхнікуме, лесатэхнічнае аддзяленьне пры полацкім лясным тэхнікуме, фізкультурны тэхнікум у Менску. Рабочы вячэрні тэхнікум у Гомелі, яўрэйскае аддзяленьне пры Віцебскім мастацкім тэхнікуме.

С.-г. школы—яўрэйская с.-г. школа ў Віцебскай акрузе, школа па вінакурэньні і па выпрацоўцы крухмалу ў Чырвоным Беразе, школа па апрацоўцы драўніны ў Барысаве, лясная школа ў Васілевічах і с.-г. школа ў Беліцы.

Індустрыяльныя прафшколы—школы дарожных майстроў і дзесятнікаў, школы хэмікаў у Гомелі і Менску, школа мэдычных сясьцёр у Віцебску, вячэрнія 2-х гадовыя бухгальтарскія курсы, і 2-х гадовыя курсы дзесятнікаў. Яўрэйскае аддзяленьне пры магілёўскім палітасьветным тэхнікуме, 4-х гадовая вопытна-паказальная школа пры слуцкім белпэдтэхнікуме, 2-х камплектная вясковая школа, вопытна-практыкавальны дзіцячы сад пры менскім белпэдтэхнікуме, школы літоўскай і польскай сялянскай моладзі.

Палітасьветныя ўстановы—вячэрні рабочы ўнівэрсытэт у Віцебску, цэнтральны палітыка-асьветны габінэт у Менску, дом партасьветы ў Менску.

Апрача таго намечана рэарганізацыя некаторых навучальных устаноў. Так, Курасоўская с.-г. школа рэарганізуецца ў яўрэйскі с.-г. тэхнікум.

Пастанова Наркамасьветы аб адкрыцьці новых навучальных устаноў перадана на зацьвярджэньне СНК БССР.

МЕНСК

Акруговая канфэрэнцыя саюзу Бязбожнікаў

Менскі акруговы савет саюзу Бязбожнікаў склікае на 1-га чэрвеня акруговую канфэрэнцыю саюзу. На канфэрэнцыю зьедзецца каля 200 чал. дэлегатаў ад раённых і гарадзкіх ячэек Бязбожнікаў. Асноўнае пытаньне, якое абмяркуе канфэрэнцыя, гэта задачы антырэлігійнай прапаганды сярод працоўных мас і антырэлігійнага выхаваньня ў школах.

Падрыхтоўка работнікаў прылаўку

У сувязі з чысткай савецкага апарату, Менскі ЦРК супольна з біржай працы арганізуе 6-тыднёвыя курсы для беспрацоўных па падрыхтоўцы работнікаў прылаўку. На курсы будзе прынята 200 чал. Удзень курсанты будуць практыкавацца ў магазынах і крамах ЦРК, а ўвечары—праходзіць тэарытычную падрыхтоўку. Кожны курсант будзе атрымліваць 25 руб. стыпэндыі ў месяц. Курсы пачнуць працаваць праз тыдзень.

Адкрыцьцё Менскага іпадрому

Вядзецца падрыхтоўка да адкрыцьця ў Менску сэзону коннага спорту. Прыводзіцца ў парадак іпадром, які адкрываецца 25-га мая. Іпадром будзе знаходзіцца пад загадам дывізіі імя ангельскага пралетарыяту. Уваход для ўсіх жадаючых дармовы.

У праграму конных спаборніцтваў пры адкрыцьці сэзону 25 мая ўваходзіць—групавая рубка конных узводаў, конкурэнцыя маладых чырвонаармейцаў праз 7 бар'ераў вышынёю да 1 мэтру, індывідуальная рубка для маладых чырвонаармейцаў і камскладу. Для чырвонаармейцаў—5 сэрый, для малодшага камскладу—7 сэрый, для сярэдняга і старэйшага камскладу—9 сэрый.

За дзень

ПЛЕНУМ БЕЛБЮРО САЮЗУ ЧЫГУНАЧНІКАЎ. 25 мая ў Менску адбудзецца чарговы пленум Белбюро саюзу чыгуначнікаў. На абвестцы для вынікі абсьледваньня прафсаюзнай работы на транспарце Беларусі, вынікі мерапрыемстваў па падняцьці вытворчасьці працы і прадсысцыпліны і іншыя пытаньні. На пленум прыяжджае таксама адказны сакратар міжнароднага камітэту прафпрапаганды пры ЦК саюзу чыгуначнікаў тав. Ачканаў, які зробіць даклад аб рабоце камітэту.

РАБОЧЫХ—У ДАМЫ АДПАЧЫНКУ І НА КУРОРТЫ. Сёлета рабочым тэкстыльшчыкам Беларусі прадстаўлена 181 месца ў дамох адпачынку, 15 месц па курортах і 25 у санаторыях. Усе месцы разьмеркаваны па тэкстыльных прадпрыемствах.

НОВЫ ЗАВОД. Распрацоўваецца праект пабудовы ў Магілеве заводу па перапрацоўцы касьцей. Завод разьлічаны на перапрацоўку 10 тысяч тон касьцей у год. Прадукцыя заводу—касьцяная мука пойдзе на ўгнаеньне палёў. Да будаўніцтва будзе прыступлена ў 1929-30 годзе.

Экскурсія ў Ленінград. 24 мая ўвесь выпускны курс Менскага рабфаку ў ліку 70 чалавек выяжджае на экскурсію ў Ленінград. Экскурсанты прабудуць там каля тыдню.

Дармовыя месцы на курортах і дамох адпачынку. Белдзяржстрах вылучыў з ліку асоб, застрахаваўшых сваё жыцьцё, 2 чалавек для дармовай адпраўкі на курорты, 5—у дыетычную сталоўку і 35 чал.—у дамы адпачынку.

Канфэрэнцыя работнікаў сувязі. 25-га мая ў Менску склікаецца акруговая канфэрэнцыя членаў саюзу Нарсувязі.

Паказальны суд над злодзеем. Сёньня, а 7 г. ув., у клюбе Ільліча адбудзецца паказальны суд над служачым-чыгуначнікам **МЕШЧУКАВЫМ**, які абвінавачваецца ў крадзяжы на чыгунцы.

ВЯЧЭРНІЯ КУРСЫ Ў МАГІЛЕВЕ

Распачалі працу 1½ месячныя вячэрнія курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў летняй маскавай і сэкцыённай фізкультпрацы ў Магілеве. На курсах займаецца 134 чалавекі.

Яўрэйскія пісьменьнікі вярнуліся ў Менск

У Менск вярнуліся яўрэйскія пісьменьнікі Харык і Аксельрод, якія былі запрошаны на Украіну украінскімі яўрэйскімі пісьменьнікамі для ўстанаўленьня больш цеснай сувязі паміж яўрэйскай культурай Беларусі і Украіны.

Пісьменьнікі наведалі Кіеў, Адэсу і Харкаў, дзе былі горача спатканы рабочымі масамі. У Адэсе ў гонар пісьменьнікаў было наладжана 13 літаратурных вечароў, у Кіеве—вялікі інтэрнацыянальны літаратурны вечар.

Новы парадак выдачы прадуктаў у крамах МЦРК

МЦРК уводзіць новы парадак папярэдніх заказаў на прадукты. Пры новай сыстэме пайшчык вярочваецца да загадчыка крамаю і паказвае прадукты, якія яму трэба падрыхтаваць. На заўтра, або праз 2-3 дні пайшчык можа прыйсьці і атрымаць прадукты. Новы парадак водпуску прыступлена ў 1929-30 годзе.

Экскурсіі ў Ленінград. 24 мая ўвесь выпускны курс Менскага рабфаку ў ліку 70 чалавек выяжджае на экскурсію ў Ленінград. Экскурсанты прабудуць там каля тыдню.

Дармовыя месцы на курортах і дамох адпачынку. Белдзяржстрах вылучыў з ліку асоб, застрахаваўшых сваё жыцьцё, 2 чалавек для дармовай адпраўкі на курорты, 5—у дыетычную сталоўку і 35 чал.—у дамы адпачынку.

Канфэрэнцыя работнікаў сувязі. 25-га мая ў Менску склікаецца акруговая канфэрэнцыя членаў саюзу Нарсувязі.

Паказальны суд над злодзеем. Сёньня, а 7 г. ув., у клюбе Ільліча адбудзецца паказальны суд над служачым-чыгуначнікам МЕШЧУКАВЫМ, які абвінавачваецца ў крадзяжы на чыгунцы.

Справа былых працаўнікоў Белдзяржвыдавецтва

25-га мая Менскі акруговы суд пачне слухаць справу былых працаўнікоў Белдзяржвыдавецтва Левінсона, Шлёнокага і Гур'ева, якія прыцягваюцца да адказнасьці за злоўжываньні па службе.

Справа будзе слухацца ў паказальным парадку ў клюбе друкароў.

Саўба ў прыгарадных саўгасах канчаецца

Сяўба па ўсіх 6 менскіх саўгасах канчаецца. Учора скончана сяўба аўса. Раньняя бульба, а таксама капуста і іншая раньняя гарадніна ўжо пасаджаны. Насеньнем гарадзкія саўгасы забясьпечаны поўнасьцю. Сёлета Менсельпром упэрыўшыню ўжывае ў шырокім маштабе попел. Для ўгнаеньня сабрана каля 1.500 пудоў попелу.

„Зьвязда“ дапамагла

◎ **ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ** былы гандляр **Ліўшыц**, які па пратэкцыі папаў на працу ў **Забялышанскае** спажывецкае таварыства (Магілеўшчына). Справа выкрыта рабкораўскай заметкай **«Абураючы пратэкцыянізм»**, пасланай на расьсьледваньне ў Магілеўскую АКК-РСІ.

◎ **ВЫКРЫТА 74 ДЗЕСЯЦІНЫ ПАХАЦІ** ў в. **Рудня** (Лагойскі раён, Меншчына). Сяляне разам з сельсаветам некалькі год утойвалі ад падатку паказаную пахаць. Селькораўская заметка **«Законнае ўтойваньне зямлі»** расьсьледваньнем пацьвярдзілася. Утойшчыкі аштрафаваны, а за выкрытую зямлю павялічан падатак.

◎ **АБ КАМАНДЫРАВАНЫХ НА КУРСЫ»** дарожных майстроў пісаў нам селькор **«Падзяка.»** Ён пісаў, што **Пухавіцкі** РВК камандыраваў на курсы ў Менск двох. Адзін з пасланых—батрак, член саюзу с.-г. і лес. рабочых быў прыняты ўмоўна, а другі—падрадчык, пазбаўлены права голасу.

Расказэнка здолеў пралезьці на курсы і быў залічаны на стыпэндыю. Расьсьледваньнем заметкі Мен. РСІ высьветлілася, што **Расказэнка** пралез па фальшывай спраўцы, атрымаўшы ім ад камітэту сялянскай узаемадапамогі.

Расказэнка выключаны з курсаў, а старшыня КСУ (прозьвішча не вядома) прыцягваецца да крымінальнай адказнасьці за выдачу няправільных дакумантаў.

◎ **АБВЕШЧАНА СУРОВАЯ ВЫМОВА** з папярэджаньнем канцлёру Мазырскай касы адшчадкасьці **Юркевічу.** Ён скарыстоўваў камандыроўку, каб заехаць дамоў і пагасьціць дзень-другі.

Акрамя гэтага **Юркевіч** вёў сябе нетактычна пры праверцы Калаткевіцкай касы ашчадкасьці. Справа ўзьнята допісам селькора **«Хлестакоў з Мазыра».**

◎ **У НАРАЎЛЯНСКІМ РАЁНЕ** (Мазыршчына) некаторыя разумелі самакрытыку пасвойму. Напрыклад, **Нараўлянскі** групком саюзу саўгандальслужачых склікаў сход для разбору узаемаадносін адміністрацыі са служачымі. Сходам зацікавіліся некаторыя члены саюзу сельгаслесарабочых, але іх са сходу «папрасілі». Вывялася, што на сходзе разьбіралі злачынствы загадчыка і працаўнікоў каапэрацыі (куплялі самі ў сябе дэфіцытны тавар звыш нормы). Заметка **«Самакрытыка пры зачыненых дзьвярах»** расьсьледваньнем ЦП пацьвярдзілася. Старшыня каапэрацыі т. **Казлоў** зьнімаецца з працы.

◎ **НАСТАЎНІК** павінен у першую чаргу падтрымліваць краязнаўчую справу. А вось загадчык **Гарадзецкай** сямігодкі, Рагачоўскага раёну (Бабруйшчына), Паўлаў, наадварот, зьнішчыў краязнаўчы музэй школы. Гэты музэй да прыходу ў школу **Паўлава** быў створаны сіламі вучняў пад кіраўніцтвам настаўнікаў. Заметка **«Барбар асьветнік»** (газ. «Зьвязда» ад 3/XI-28 г.) пацьвердзілася і, як паведамляе **Рагачоўскі** РВК, Паўлаў атрымаў суровую вымову і зьняты з пасады загадчыка школы.

◎ **ДЭФІЦЫТ САЎГАСУ БАЦЭВІЧЫ**—вынік асабістых разрахункаў паміж кіраўнікамі вучастку Лесбелу і кіраніком саўгасу. Гэта ўстанавіла камісія **Клічаўскага** РК КП(б)Б, якая была выдзелена для праверкі фактаў безгаспадарчасьці, зазначаных у заметцы селькора **«Безгаспадарчасьць Лесбелу і Сьвіслацкага лясьніцтва зрывае працу саўгасу Бацэвічы»** («Зьвязда» № 8). Селькор пісаў, што Лесбел і Сьвіслацкае л-ва, якія па ўмове з саўгасам павінны былі дастаўляць сырэц на пільню саўгасу, ня выконвалі ўмовы, чым прымусілі прыпыніць працу пільні.

Пастановай Бабруйскай АКК-РСІ справа перадана пракуратуры.

Тэхпэрсанал павінен несьці большую адказнасьць

Яшчэ і дагэтуль наглядаюцца выпадкі непамернага разыходжаньня папярэдняга будаўнічага каштарысу з лічбамі сапраўдных затрат. Звычайнымі сталі ў нас пераробкі ў працэсе работ розных частак будынкаў, якія прыводзяць, урэшце, да падаражаньня кошту пабудоў. Будаўнічыя работы і дагэтуль праводзяцца на падставе ня зусім прапрацаваных праектаў.

Усё гэта гаворыць за тое, што інжынэрна-тэхнічны пэрсанал не ва ўсіх выпадках праяўляе неабходныя сур'ёзныя адносіны да даручанай яму справы. Мы тут маем невыстарчальны тэхнічны нагляд за будаўніцтвам, які вводзіцца толькі да фармальнага прагляду праекту і далей ня ідзе. Доля віны, і досыць вялікая, усклада́ецца і на гаспадарчыя арганізацыі, якія звычайна ўступаюць у будаўніцтва в вялікім спаўзьненьнем і наганяюць хуткасьць у працэсе самога правядзеньня работ, ня будучы да таго-ж досыць падрыхтаванымі. Калі пабудова ўжо ідзе і рабочыя не чакаюць,—рабочых чарцяжоў няма—прыходзіцца іх фабрыкаваць без належнае ўвязкі і праверкі (прыкладам можа служыць пабудова дому «Домстрою»).

Як-бы там ні было, з гэтага моманту на інжынэрна-тэхнічны пэрсанал будзе ўскладацца ў поўнай меры адказнасьць за лёс будаўніцтва ў сэнсе яго дабрабыту з тэхнічна-эканамічнага боку.

На ўсесаюзным зьезьдзе інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў гэты момант быў асабліва выпукла і не спаткаў супярэчнасьцяй удзельнікаў зьезду.

Тэхнічныя памылкі павінны на будучы час быць зьведзены да мінімуму, бо кожная з іх цяжка адбіваецца на кошце і якасьці будаўніцтва. А таму прапрацоўка аб'ектаў будаўніцтва павінна быць досыць глыбокай і дакладнай.

Інжынэрна-тэхнічнаму пэрсаналу неабходна правяць максымум увагі да даручанае яму справы, прымаючы пад увагу, што роля, якая займаецца ім у будаўніцтве, ускладае на яго вялікую і сур'ёзную адказнасьць за гэтае будаўніцтва.

КУЛЬКІН.

Вялікія непарадкі ў будаўніцтве

У горадзе Рагачове для намечаных да пабудовы дамоў пачалі падвозіць цэглу. Вазілі цэглу з Магілеву і Ціхініч, навезьлі шмат цэглы. Ну, а потым пачалі гэтую самую цэглу зноў вазіць назад на станцыю, затраціўшы на гэтую апэрацыю шмат грошай. Атрымліваем досыць яскравы малюнак—прывезеную ў Рагачоў цэглу возяць на пляц, у горад, а потым зноў яе возяць на станцыю, зноў грузяць, а там зноў будуць выгружаць. Такім чынам, шмат цэглы ламаецца, крышыцца і гіне. А выдаткі ўсё растуць.

Справа ясная—нехта вінаваты ў гэтай бясчыннай справе, трэба толькі тэрмінова высьветліць, хто ў гэтым вінаваты. і прыцягнуць таго да адказнасьці.

Г. МЭЙЦІН.

«СПОРТ»

Стралковыя спаборніцтвы. Учора ў Менску адбываліся стралковыя спаборніцтвы паміж старайшым і сярэднім кампалітскладам дывізіі імя ангельскага пралетарыяту, у якіх удзельнічала больш 50 чал. Умовы—стральба з 3-х лінейнай расійскай вінтоўкі на 300 мэтраў—мішэнь № 3. Устаноўка з 100 магчымых даць 90 ачкоў. Стральба па спаборніцтвах вялася і з ангельскіх вінтовак. Удзельнічала 30 чал. У стралковых спаборніцтвах паасобна прымалі ўдзел малодшы камснлад і чырвонаармейцы

Конкурс на лепшы ўзвод па фізкультуры. 20 мая пачаліся спаборніцтвы на лепшы ўзвод дывізіі імя ангельскага пралетарыяту па фізкультуры. У праграму спаборніцтва ўваходзіць: каманднае 6-цібор'е, бег на 100 мэтраў, кіданьне гранат на 30 мэтраў, скок цераз каня і г. д.

Конны спорт. 23-га мая ў дывізіі імя ангельскага пралетарыяту пачнецца конкурс узводаў на пяршынства па конным спорце. Праграма: язда і індывідуальнае ўладаньне халоднай зброяй.

Пытаньне аб канцэнтрацыі піва-прамысловасьці канчаткова яшчэ ня вырашана

У зьвязку з тым, што ў газ. «Зьвязда» № 108 была зьмешчана заметка «Закрывоюцца тры бравары», ВСНГ БССР паведамляе, што пытаньне адносна канцэнтрацыі піва-прамысловасьці ў БССР перадана на разгля